Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 31 (5705) | 8 лютага 1937 г., панядзелак | ЦАНА 10 КАП.

МОСКВА ... ИН.ТУТ ... И ПРАВА

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

Інфармацыйнае паведамленне аб рабоце пленума ЦК КП(б)Б.

Перадавы: Выкарчаваць небольшэвіцкую практыку работы, яшчэ вышэй узняць рэволюцыйную пільнасць.

Пісьмо Рамэн Ралана на імя прэзідэнта Акадэміі навук БССР.

Удзельнікі грандыёзнага велапрабегу прыбылі ў Маскву.

Новымі вытворчымі перамогамі адзначаюць працоўныя праект Канстытуцыі БССР.

Усебеларуская нарада па конегадоўлі.

Аддание суду віноўнікаў аварыі на шахце «Шахтантрацыт».

Чынун — Чыгуначнікі Гомеля ліквідуюць вынікі шкодніцтва.

М. Стрыгельскі — Сарваць маску з ворагаў народу.

П. Броўка — Узброенае слова паэта.

Е. Столін, А. Лебедзеў — На заводзе імя Мяснікова арудуе класавы вораг.

Да стагоддзя з дня смерці А. С. Пушкіна. Урачыстае пасяджэнне Акадэміі навук БССР.

За рубяжом — Няўдача мяцежнікаў на паўднёвым фронце. — Замежныя водгукі на прыгавор вархоўнага суда. — Інтрыгі Рыбентропа ў Англіі.

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ

Днямі адбыўся пленум ЦК КП(б)Б.

Пленум аслабаніў тав. Н. Ф. ГІКАЛО ад абавязкаў першага сакратара Цэнтральнага Камітэта Комуністычнай партыі (большэвікоў) Беларусі ў звязку з абраннем яго першым сакратаром Харкаўскага абкома КП(б)У.

Пленум абраў тав. СУРТУ членам бюро ЦК КП(б)Б і т. т. Рубінштэйна, Готфрыда і Аўгустайціса кандыдатамі ў члены бюро ЦК КП(б)Б.

ВЫКАРЧАВАЦЬ НЕБОЛЬШЭВІЦКУЮ ПРАКТЫКУ РАБОТЫ, ЯШЧЭ ВЫШЭЙ УЗНЯЦЬ РЭВОЛЮЦЫЙНУЮ ПІЛЬНАСЦЬ!

Сёння мы публікуем інфармацыйнае паведамленне аб рабоце пленума ЦК КП(б)Б, які засядаў гэтымі днямі.

Пленум вызваліў ад работы першага сакратара ЦК КП(б)Б тав. Гікало Н. Ф. у сувязі з абраннем яго першым сакратаром Харкаўскага абкома КП(б)У. Кожнаму працоўнаму вядома роля тав. Гікало ў Беларусі. Цвёрдакаменны большэвік, які прайшоў школу грамадзянскай вайны, безаблежна адданы справе партыі, ён лічыў вышэйшым прынцыпам усіх сваіх паводзін усёй сваёй работы — быць паслядоўным вучнем вялікага Сталіна, дакладна і няўхільна выконваць указанні ЦК ВКП(б) і асабіста таварыша Сталіна. У гэтым духу ён выхоўваў партыйную арганізацыю, навучаючы яе ўменню распазнаваць ворага і граміць яго.

Выконваючы ўказанні таварыша Сталіна, праводзячы ў жыццё ленінска-сталінскую нацыянальную палітыку, выкрываючы нацдэмаў — ворагаў народу, КП(б)Б, на чале з тав. Гікало, вырасціла моцных большэвікоў, партыйных і непартыйных. Партыйная арганізацыя КП(б)Б за гэтыя гады ўзмацнела. Ворагі і хістаючыяся выкінуты з радоў партыі. Групоўшчына, якая некалі ліхаралзіла арганізацыю, рашуча пераможана. Нанесен сур'ёзны ўдар расхлябанасці і падхалімству, народжаным спецыфічнымі ўмовамі жыцця беларускага і нурэйскага народу ў мінулым, мястачковасцю.

Большэвіцкія прынцыпы сталі правілам паводзін члена КП(б)Б. Але іменна зараз, калі тав. Гікало перайшоў на другую работу, нам, як ніколі, трэба памятаць аб ворагу, аб выкарыстанні ім усіх і ўсялякіх звычак, што засталіся ў народу ў спадчыну ад мінулага, для барацьбы супроць КП(б)Б і совецкай улады.

Ніякай самасупакоенасці не павінна быць у нашых радах! Вораг хітры і каварны. Ён умела маскіруецца, праводзячы сваю гнусную работу, накіроўваючы свой удар у крэпасць абароны рэспублікі.

Не можа быць зараз ніякага сумнення ў тым, што на чыгунках і заводах транспарту, размешчаных на тэрыторыі Беларусі, працавала шайка гнусных трацкісцкіх бандытаў. Партыйныя арганізацыі Віцебска і Гомеля праглядзелі, своечасова не выкрылі ворага.

Сёння мы публікуем артыкул, які сігналізуе аб рабоце ворага на заводзе імя Мяснікова. Вораг праводзіць сваю агідную работу і ў сельскай гаспадарцы, імкнучыся знішчыць конскае пагалоўе, раскрадваючы калгаснае дабро і тым самым знижаючы кошт працадня, каб выклікаць незадаваленне калгаснікаў рэзультатамі сваёй працы ў калгасе.

ЦК ВКП(б) на ўроках партыйных арганізацый Азова-Чорнаморскага края і Кіеўскай вобласці вучыць, што там, дзе кіраўнікі партыйных арганізацый страцілі густ да партыйнай работы, перадаверяюць яе людзям-другарадным, а самі захапляюцца зводкамі, лічбамі, падменай дырэктараў прадпрыемстваў, старшынь райвыканкомаў і сельсоветаў, там, як правіла, вораг, калі ён пралазае, не заўважаюць.

Практыка паказвае, што аналагічныя выпадкі ёсць і ў КП(б)Б. Так, перад парткомам менскага педінстытута стаіць вялізарная задача па выхаванню студэнтаў, а ён, замест таго, каб штодзённа выконваць яе, на сваіх пасяджаннях абмяркоўвае пытанні аб размеркаванні аўдыторый і колькасці стэнаграм, якія павінна друкаваць вучэбная частка. Зразумела, што ў такой атмасферы вораг адчувае сябе, як рыба ў вадзе.

Многія райкомы КП(б)Б падмяняюць райвыканкомы, апякаюць іх замест таго, каб навучыць іх прапаваць і адказваць за сваю работу. Прыкладам такой падмены можа служыць Клімавіцкі райком. На сваім пасяджанні райком палічыў магчымым паставіць пытанне аб забеспячэнні электрастанцыі дровамі. Зусім ясна, што з гэтым пытаннем палкам мог-бы справіцца райвыканком. Гэты прыклад — прамое сведчанне грубай падмены райвыканкома з боку бюро райкома, прыклад вялізнага захаплення гаспадарчымі пытаннямі, прыклад поўнага забыцця райкомам свайго абавязку.

Часцей за ўсё такая небольшэвіцкая практыка прыводзіць да паслаблення пільнасці, да самасупакоенасці і зазнайства.

ЦК КП(б)Б выкрыў факты дзяляцкага захаплення гаспадарчымі пытаннямі і страты палітычнай пільнасці ў быхаўскай і лепельскай партыйных арганізацыях. Сакратар быхаўскага РК тав. Рэзнікаў, страціўшы палітычнае чуццё і рэволюцыйную пільнасць, закінуў партыйна-палітычную работу. Замест штодзённай крапатлівай работы па выхаванню комуністаў, мабілізацыі партыйнай арганізацыі на павышэнне рэволюцыйнай пільнасці, Рэзнікаў падзяляцку палышоў да ладу сур'ёзных фактаў, меўшых месца ў быхаўскай партыйнай арганізацыі; не прыцягнуў увагі да гэтых фактаў партыйнай арганізацыі, чым, па сутнасці, разброіў яе ў барацьбе з ворагам, паслабіў яе боездольнасць. Такое прытупленне класавай пільнасці было скарыстана ворагам супроць партыі і совецкай улады.

Сакратар лепельскага райкома КП(б)Б Пацэнгель, стаўшы на шлях заціску крытыкі і грубага парушэння статута партыі, адарваўся ад партыйнай масы, страціў рэволюцыйную пільнасць, даўшы магчымасць класаваму ворагу праледзі ў апарат райкома і на кіруючую совецкую работу.

Гэтыя факты — сур'ёзнае папярэджанне ўсім партыйным арганізацыям КП(б)Б. З іх трэба зрабіць неабходныя вывады. Не павінна быць у нашай арганізацыі, працуючай на граніцы з капіталістычным светам, небольшэвіцкай практыкі, дзяляцкага захаплення гаспадарчымі пытаннямі, падмены гаспадарчага і совецкага кіраўніцтва.

Сакратар райкома або парткома, не нянька ці апякун, а палітычны работнік, закліканы займацца перш за ўсё выхаваннем комуністаў, арганізаваньй масавой палітычнай работы ў раёне, на прадпрыемствах, палітычным кіраўніцтвам. Хто не зразумеў гэтага і не перабудуе сваёй работы адпаведна патрабаванням партыі, той адстае, стрымлівае боездольнасць арганізацыі ў барацьбе з ворагам.

У 126 артыкуле Канстытуцыі Саюза ССР указана, што партыя — перадавы атрад працоўных у іх барацьбе за ўмацаванне і развіццё соцыялістычнага ладу і кіруючае ядро ўсіх арганізацый працоўных, як грамадскіх, так і дзяржаўных.

Соцыялізм, умацаванне і развіццё яго — галоўнае ў жыцці комуніста. Дзеля гэтага ён пайшоў у партыю, дзеля соцыялізма ён жыве і працуе.

Комуніст — прыклад на прадпрыемстве, узор для ўсіх рабочых. Гэта — галоўнае патрабаванне да комуніста. Не выконваючы гэта патрабаванне, член партыі не можа лічыцца комуністам. І гэта зусім зразумела, бо соцыялізм мы куем сваёй работай для варштата, на заводах, для трактара, на соцыялістычных палях. Але сёння гэтага яшчэ мала. Комуніст павінен умець растлумачыць масам вучэнне аб соцыялізме і комунізме, а для гэтага неабходна быць падкаваным. Вось чаму комуніст павінен вучыцца, вось чаму сакратар райкома, не арганізуючы выхаваўчай работы, не арганізуючы прапаганды марксізма-ленінізма, не выконвае сваёй асноўнай ролі.

Вораг арудуе. Гэта трэба памятаць. Навучаць комуністаў распазнаваць ворага, трымаць руку на палітычным пульсе раёна, завода, калгаса, саўгаса, МТС, умець слухаць сігналы мас і хутка на іх рэагаваць, выпаліць гарачым жалезам роўнадушша да запатрабаванняў працоўных — вось над чым павінен прапаваць зараз сакратар райкома і сакратар парткома арганізацыі КП(б)Б.

Аб гэтым асабліва трэба напомніць партыйным арганізацыям і членам КП(б)Б сёння, калі мы праважаем тав. Н. Ф. Гікало, які яшчэ здалёк чуў гук, раздаўшыйся ад варожага поступу і ўмеў хутка настроіць партыйную арганізацыю ў баявую калону, гатовую грудзьмі абараняць сваю вялікую партыю Леніна — Сталіна, сваю магутную пячаслівую радзіму — СССР.

ПЛЕНУМ БЮДЖЭТНАЙ КАМІСІІ ЦВК БССР

Для разгляду адзінага дзяржаўнага бюджэта БССР на 1937 год склікаецца 13 лютага 1937 года пленум бюджэтнай камісіі ЦВК БССР.

Пасяджэнне адбудзецца ў 6 гадзін вечара ў зале пасяджэнняў прэзідыума ЦВК БССР — Дом урада, 2-гі паверх.

Старшыня Бюджэтнай Камісіі ЦВК БССР НІЗАЎЦОЎ.

ПІСЬМО РАМЭН РАЛАНА

НА ІМЯ ПРЭЗІДЭНТА АКАДЭМІІ НАВУК БССР тав. І. З. СУРТА

Вільнеў, 20 студзеня 1937 года.

«Дарагі таварыш І. СУРТА!

Я дзякую Вам за Ваша пісьмо ад 13 студзеня г. г. Я шлю Акадэміі навук Беларусі свае сардэчныя прывітанні і мае лепшыя пажаданні добрай працы, карыснай для развіцця СССР і ўсяго чалавецтва.

Я не магу, нажаль, нічога Вам паслаць аб Пушкіне. Я яго не ведаю так добра, каб мець права аб ім гаварыць. Я яшчэ не ведаю даволі добра рускай мовы—якую я вывучаю, каб мець магчымасць меркаваць аб мастацкіх творах на гэтай мове: я не ведаю французскіх перакладаў твораў Пушкіна, і я сумняваюся ці ёсць добрыя пераклады яго вершаў. Вялікія паэты хочуць, каб іх перакладалі паэты.

Я разумею вельмі добра важнасць юбілею Вашага вялікага паэта, я далучаюся ўсім сэрцам да ўсяго таго, што будзе зроблена, каб яго адсвяткаваць, я жадаю, каб яго слава і яго творы распаўсюджваліся, нарэшце, каб развівалася сярод усіх мас СССР любоў да мастацтва і да культуры. Але на мой жаль я не магу вызваліцца ад грамадскіх абавязкаў, якія ў нас у Францыі неалкладны, каб напісаць літаратурны артыкул на тэму, якая павінна была-б у мяне заняць шмат часу для вывучання, каб яе распрацаваць вартым Пушкіна спосабам.

Так што выбачце мне, дарагія прыяцелі. Я вам усім паціскаю рукі.

РАМЭН РАЛАН».

УДЗЕЛЬНІКІ ГРАНДЫЁЗНАГА ВЕЛАПРАБЕГУ ПРЫБЫЛІ Ў МАСКВУ

МАСКВА, 7 лютага. (БЕЛТА). Удзельнікі грандыёзнага велапрабегу удоўж граніц Совецкага Саюза пасля кароткага адпачынку ў Краснае (пад Масквой) 6 лютага ў 9 гадзін 30 мінут раніцы выйшлі на Маскву.

У 2 гадзіны дня адважная пяцёрка веласіпедыстаў у складзе дынамаўцаў-пагранічнікаў тт. Людмірскага, Шубіна, Радзевіча, Морава і Тімафеева ўступіла ў сталіцу і накіравалася праз горад да стадыёна «Дынама». Масквічы цёпла віталі пагранічнікаў, устанавіўшых новы сусветны рэкорд дальнасці велапрабегу.

У 16 гадзін дынамаўцы-пагранічнікі спыніліся на плошчы каля стадыёна «Дынама». Тут іх сустрэлі прадстаўнікі Галоўнага кіраўніцтва пагранічнай і ўнутранай аховы Наркамата ўнутраных спраў, фізкультурнікі сталіцы, радні, сябры і таварышы. Тысячы масквічоў поўнымі захаплення воклічамі віталі ад важную пяцёрку. Маскоўскія фізкультурнікі падносілі веласіпедыстам велізарныя букеты жывых кветак.

Мітынг. Героям непераўзойдзенага велапрабегу віталі: нам. начальніка Галоўнага кіраўніцтва пагранічнай і ўнутранай аховы НКУС — корпусны камісар тав. Рашаль, намеснік старшыні Усесаюзнага камітэта па справах фізкультуры і спорту тав. Кальпус і прадстаўнікі маскоўскіх фізкультурных арганізацый.

З адказнай прамовай выступіў камандор прабегу тав. Людмірскі. Апошнія словы яго, поўныя любві да вялікага Сталіна, патанулі ў гарачых воплесках шматтысячнага натоўпу.

Удзельнікі велапрабегу звярнуліся з рапартам да таварышоў Сталіна, Молатава, Варашылава і Ежова.

НОВЫМІ ВЫТВОРЧЫМІ ПЕРАМОГАМІ

АДЗНАЧАЮЦЬ ПРАЦОЎНЫЯ ПРАЕКТ КАНСТЫТУЦЫІ БССР

НАТХНЁНЫЯ ПРАЕКТАМ КАНСТЫТУЦЫІ

МОЗЫР. Натхнёныя праектам Канстытуцыі БССР, рабочыя мозырскіх прадпрыемстваў адказваюць на гэты гістарычны дакумент новым уздымам вытворчага энтузіязма. Вывучаючы праект Канстытуцыі ў цэхах, у брыгадах, стаханаўцы і ўдарнікі мэблевай фабрыкі «Комінтэрн» узялі на сябе абавязацельства павысіць прадукцыйнасць працы з такім разлікам, каб план 1937 года выканаць да XX гадавіны Кастрычніка.

За абавязацельствамі паследвалі справы. Назаўтра пасля вывучэння праекта Канстытуцыі стаханаўцы фабрыкі далі небывала высокую выпрацоўку. Столяр зборачнага цэха Верхановіч 4 лютага выканаў сваю норму на 330 проц., да гэтага ён даваў 300 проц. Столяр таго-ж цэха Крыпс у гэты дзень выканаў сваю норму на 230 проц., а раней яго выпрацоўка не перавышала 180 проц. Столяр Пархоменка раней выконваў сваю норму на 175 проц., а 4 лютага выканаў яе на 204 проц. На заводзе «Пхоў» таксама ўзнялася хваля вытворчага ўздыму. Стахановец-шпаларэзчык Ейчарук раней абразаў 280—300 шпал, а 4 лютага абразаў 374. Канцарэзчык Худзякоў у гэты дзень выканаў сваю норму на 153,3 проц. Возчыкі Карнявец і Дзікан перавезлі 4 і 5 лютага па 17 кубаметраў лесаматэрыялу, а раней яны перавозілі не больш 11—12 кубаметраў.

У адзнаку праекта новай Канстытуцыі кандзіцерскі цэх хлебазавода 4 лютага выканаў сваё дзённае задание на 140 проц.

ФРАЛОЎ.

З ПАТРОЕНАЙ ЭНЕРГІЯЙ

ЧАВУСЫ. Праект Канстытуцыі БССР выклікаў хвалю вытворчага ўздыму. У калгасах арганізаваны новыя рэкордныя звенні. Зараз у калгасах налічваецца ўжо 119 стаханаўскіх звенняў.

Калгаснікі калгаса імя Кірава, Галавенчыцкага сельсавета, у гонар праекта Канстытуцыі поўнасцю завяршылі засыпку насення добраякасным зярном і адраманавалі сельскагаспадарчы інвентар. Кіраўцы звярнуліся да ўсіх калгаснікаў раёна з заклікам арганізаваць дастойную сустрэчу Надзвычайнаму XII Усебеларускаму З'езду Советаў — поўнасцю завяршыць падрыхтоўку да стаханаўскай вясны.

— Добрай падрыхтоўкай да сяўбы, стаханаўскай работай у часе сяўбы даб'ёмся сталінскага ўраджаю на нашых соцыялістычных палях, — пішуць кіраўцы ў сваёй адозве. — Шырокім разгортваннем спаборніцтва паміж брыгадамі, звеннямі заваюем права заняць сваімі экспанатамі ганаровае месца на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы.

Брыгадзір другой брыгады калгаса імя Мархлеўскага, Антонаўскага сельсавета, т. Кастрыца заявіў:

— Праект Канстытуцыі натхняе нас — усю брыгаду, мы будзем з патроенай энергіяй змагацца за высокі ўраджай.

Ва ўсіх калгасах і саўгасах абмеркаванне праекта Канстытуцыі ўзняла тэмпы падрыхтоўкі да вясны. Заклік калгаснікаў калгаса імя Кірава знайшоў гарачы водгук сярод калгаснікаў і калгасніц. Уся падрыхтоўка да З'езда праводзіцца пад лозунгам — заваюем права прымаць удзел ва Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы.

БЕРАЗОЎСКАЯ.

НОВЫ ПРЫЛІЎ У КАЛГАСЫ

Для вывучэння гістарычнага даклада таварыша Сталіна і новай Канстытуцыі на агульныя сходы калгаснікаў з вялікай запікаўленасцю з'яўляюцца аднаасобнікі.

За час вывучэння новай Сталінскай Канстытуцыі і даклада таварыша Сталіна па Бягомльскаму раёну ўступіла ў калгасы 34 аднаасобных гаспадаркі. 1937 стаханаўскі год былыя аднаасобнікі сустрэлі дружнай калектыўнай працай.

У калгасе імя Вароўскага, Мсціжскага сельсавета, 2 аднаасобнікі падалі заявы аб уступленні ў калгас. У калгасы Кадлубінкага сельсавета ўступіла 12 аднаасобных гаспадарак. У сваіх заявах аднаасобнікі выказваюць жаданне быць пераданымі калгаснікамі, чэсна і адзіна працаваць і берагчы калгаснае дабро. **ШУРАЎ ПАВЕЛ.**

АДКАЗ СТАХАНАЎСКАЙ РАБОТАЙ

Па-большэвіцку рыхтуюцца віцебскія чыгуначнікі да Надзвычайнага XII З'езда Советаў Беларусі, які зацвердзіць Сталінскую Канстытуцыю беларускага народу.

Прыгавор суда над злейшымі ворагамі народу з трацкісцкай банды выклікаў велізарны ўздым творчай ініцыятывы мас. Калектыў чыгуначнікаў гарыць жаданнем найхутчай ліквідаваць астаткі шкодніцтва на транспарце і ў прыватнасці на віцебскім вузле.

Выдатнейшыя прыклады работы паказвае ордэнаносец-машыніст віцебскага дэпо Нікалай Георгіевіч Зіновіч. 4 лютага ён прывёў наркомаўскі поезд № 716 (вугальны маршрут) вагой у 1818 тон у Віцебск з нагонам 48 мінут, з сярэднесутачным прабегам 1528,8 кілометра.

У гэты-ж дзень дыспетчар-ордэнаносец Іосіф Владзіміравіч Еленскі прывёў поезд № 705 па ўчастку Віцебск—Невель з сярэднесутачным прабегам 1459,68 кілометра.

Машыніст паравоза «ФД» 20—1154 Станіслаў Міхайлавіч Піульскі ў суправаджэнні дзяжурнага па дэпо Пётра Кірылавіча Івашчэнка правёў поезд № 705 ад Невеля да Віцебска з нагонам 57 мінут, чым выканаў тэхнічную хуткасць на 162,6 проц.

На ўчастку Віцебск — Орша дыспетчар І. С. Бірукоў дабіўся сярэднесутачнага прабегу поезда № 705 у 1368 кілометраў. Машыніст гэтага поезда тав. Белякоў прыбыў у Оршу з нагонам 46 мінут. Назад тав. Белякоў прывёў поезд № 910 вагой 1930 тон з нагонам у шляху да Віцебска 34 мінуты.

Машыніст віцебскага паравознага дэпо т. Панасенка адправіўся з Віцебска з поездам № 706 са спазненнем на 30 мінут (па віне станцыі), але ўвёў поезд у графік, маючы нагон да Невеля 52 мінуты, перавысіў устаноўленую па ўчастку тэхнічную хуткасць на 51 проц.

Я. І. ЧАРНОЎ.

ЧЫГУНАЧНІКІ ГОМЕЛЯ ЛІКВІДУЮЦЬ ВЫНІКІ ШКОДНІЦТВА

ГОМЕЛЬ. (Кар. «Звязды»). Банда трацкісцкіх дыверсантаў мела свайго агента і на Беларускай чыгунцы. Былы начальнік чыгункі Владзімірскі быў суўдзельнікам знішчанай банды трацкістаў. Ён шкодзіў як толькі было магчыма: на шляху, у дэпо, станцыях і розных службах чыгункі, арганізоўваў крушэнні паязноў, псаваў рухомы састаў чыгункі, прыводзіў у нягоднасць гарадку шляху.

Чыгуначнікі Беларускай чыгункі, абмеркаваўшы пісьмо чыгуначнікаў маскоўскага і тульскага вузла Дзержынскай чыгункі, прымаюць канкрэтныя захады да ліквідацыі шкодніцкай дзейнасці на сваіх участках.

Рабочыя вагонай змены тав. Жалезнякова (станцыя Гомель) у адказ на пісьмо дзержынцаў пішуць:

— Фашысцкія найміты прыклалі сваю руку і да нашага вагоннага ўчастка. Яны сваёй павуцінай імкнуліся аплесці нашы вытворчыя звенні. Яны карысталіся прытупленнем нашай пільнасці для таго, каб наносіць адчувальныя ўдары па чыгунцы. Так, напрыклад, па распараджэнню былога начальніка чыгункі—трацкіста, здрадніка Владзімірскага, нашаму пункту была спынена выдача кісларода для рамонту вагонаў. Гэты від рамонту быў пераведзен на кавальскі спосаб, што прыводзіла да зніжэння якасці, ударажала прадукцыю.

Усе 8 змен вагоннікаў, занятых на беззадзённым рамонце, мелі толькі аднаго майстра, які не паспяваў кіраваць кругласутачнай работай змен. У рэзультаце гэтага, агляд і рамонт праводзіліся павярхоўна, нізкаякасна, затрымліваліся паязды.

Далей яны пішуць:

— Мы ліквідуем вынікі шкодніцтва новым уздымам стаханаўскага руху, павышэннем нашай пільнасці. Абмеркаваўшы пісьмо дзержынцаў, мы адказваем ім наступнымі самаабавязацельствамі:

На працягу лютага зрабіць усе змены вагоннікаў стаханаўскімі, не дапускаць ні адной затрымкі ў адпраўленні паязноў з-за агляду і рамонту вагонаў; аглядаць маршрутныя паязды за 10 мінут, рамонт букс і іншых дэталей рабіць без адцэпкі вагонаў ад поезда.

Агенты гандляроў разімай пастараліся кашкодзіць і на станцыі Жлобін. Стаўленік Владзімірскага Петун імкнуўся выклікаць пажар у майстэрнях, які быў накіраваны толькі дзякуючы пільнасці рабочых.

Рабочыя станцыі Жлобін абавязаліся вышэй узняць пільнасць і выкрыць да канца ворагаў народу і іх пасобнікаў, шырэй разгарнуць стаханаўскі рух, канчаткова знішчыць аварыі і брак у рабоце. Давесці прастой мясповых вагонаў да 8 гадзін, пры плане ў 9 гадзін 20 мінут, адпраўляць паязды строга па наркаматаўскаму графіку, дакладна выконваць тэхналагічны працэс работы станцыі.

Владзімірскім і яго агентурай быў распрацован графік работы шляхавых абходчыкаў, які меў мэтай салзейнічаць у запушчэнні лініі, што павінна было, і прыводзіла да крушэнняў. Зараз гэты шкодніцкі графік адменен і ўведзен новы, які забяспечвае высокаякасную работу шляхавых абходчыкаў.

Стаханаўцы Беларускай чыгункі ў адказ на заклік рабочых маскоўскага завода «Серп и молот» і дзержынцаў прыступілі да ліквідацыі вынікаў шкодніцкай дзейнасці на чыгунцы.

ЧЫНУН.

Аддание суду віноўнікаў аварыі на шахце „Шахтантрацыт"

У студзені г. г. на шахце № 13 Багуцаева — Гарняцкага рудакіраўніцтва трэста «Шахтантрацыт» здарылася аварыя, якая папягчула за сабой чалавечыя афіары.

Заслухаўшы даклад урадавай камісіі, створанай для расследвання гэтай справы, Совет Народных Камісараў Саюза ССР пастанавіў аддаць пад суд за злачынныя адносіны да захавання правіл тэхнічнай эксплаатацыі пры спуску і пад'ёме людзей у шахце наступных работнікаў шахты № 13, якія з'яўляюцца непасрэднымі віноўнікамі катастрофы: загадчыка шахты Пасталякіна А. Л., галоўнага інжынера шахты Макаронак Ф. В., машыніста пад'ёму Залатарова П. Н., машыніста гад'ёму Зенцова Д. С. і памочніка механіка шахты Катургу А. В. Пракуратуры Саюза ССР прапанавана закончыць следства па гэтай справе ў найкарацейшы тэрмін.

Наркамцяжпрому даручана тэрмінова ажыццявіць усе прапанаваныя ўрадавай камісіяй мерапрыемствы па прывядзенню шахты № 13 у поўны парадак у адносінах тэхнікі бяспекі.

(БЕЛТА).

ПАДРЫХТУЕМ ДА СЯЎБЫ МОЦНАГА КАНЯ!

НА НАРАДЗЕ ПА КОНЕГАДОЎЛІ

6 лютага адбылася нарада конюхаў, загадчыкаў конегадоўчых ферм, брыгадзіраў, ветурачоў і зоатэхнікаў 18 раёнаў Совецкай Беларусі, скліканая сельскагаспадарчым аддзелам ЦК КП(б)Б і Наркамземам БССР.

Знатныя конюхі рэспублікі — ордэнаносец тав. Батоўкін Нікіта Ермалаевіч з калгаса «Кастрычнік» Прапойскага раёна і ордэнаносец тав. Камай І. С. з калгаса «Чырвоны баец» Кіраўскага раёна — падзяліліся з усімі конюхамі вынікамі сваёй работы па развіццю сацыялістычнай конегадоўлі. Іх вопыт работы вялікі.

У калгасе «Чырвоны баец», дзе старшым конюхам працуе ордэнаносец тав. Камай, як і ў Нікіты Ермалаевіча, коні ў добрым стане. Тав. Камай гаворыць аб рабочым дні на канюшні. У іх заўсёды добрая арганізаванасць работы, правільнае выдаткаванне кармоў, уведзена штодзенная чыстка коней. Вось чаму ў яго коні ў сярэдняй і вышэй сярэдняй сытасці, няма адыходу маладняка.

Аб сваім поспеху расказаў таксама старшы конюх калгаса «Большэвік» Горацкага раёна тав. Раўковіч І. Д.

Удзельнік нарады — старшы конюх калгаса імя Молатава Сіроцінскага раёна тав. Пальвінскі І. П. — паведаміў аб выключна дрэннай арганізацыі працы на канюшні. У іх калгасе коні за конюхамі не замацаваны, існуе паўнейшая абязлічка. Трое конюхаў даглядаюць фактычна па чарзе 31 каня. Сам Пальвінскі працуе на канюшні толькі зімой, а на лета праўленне вызначае другіх калгаснікаў. У выніку — дрэнны догляд, амаль зусім не праводзіцца чыстка коней. Характэрна, што ў раёне ведаюць аб гэтым, але ніякіх мер не прыняў ні райземаддзел, ні райвыканком.

Старшыня калгаса «Ўраджайны край» Пухавіцкага раёна расказаў наступны факт. У іх калгасе, дзе лепш пастаўлен догляд за коньмі, раённыя арганізацыі склікалі нараду конюхаў двух сельсоветаў. Конюхі сабраліся, а з райземаддзела ніхто не прыехаў. У Пухавіцкім раёне аб конюхах забыліся, з імі ніхто не працуе.

Выступаючыя конюхі, загадчыкі конегадоўчых ферм і брыгадзіры адзначалі зусім недапушчальныя, абыкавныя адносіны да конюха ў многіх раёнах. Многія скарджаліся, што з імі не арганізавана вучоба ў калгасах, не гаворачы ўжо аб раённых курсах. У тым-жа Пухавіцкім, Лёзнянскім, Жлобінскім і інш. раёнах зоаветурткі існуюць толькі фармальна. Зоатэхнічныя і ветэрынарныя работнікі слаба дапамагаюць конюхам у рабоце.

На нарадзе высветлілася, што дагэтуль не ўстаноўлена правільная аплата работы конюхаў. Па нормах Наркамзема БССР кожнаму конюху налічваецца за догляд каня ў месяц па 0,10 працадня. Усюды налічаюць пароўну, не гледзячы на тое, як конюх працуе — добра ці дрэнна. Больш таго, у многіх калгасах зусім не налічаюць працадзён за злучку і ажаробы. Конюхі нават не ведаюць аб парадку налічэння працадзён. У гэты час ёсць многа скаржэнняў у аплаце конюхам. Існуе яўная ўраўнілаўка.

На нарадзе выступіў нарком земляробства БССР тав. Бенек, які адзначыў нездавальняючае становішча конегадоўлі ў калгасах. Тав. Бенек звярнуў асаблівую ўвагу ўсіх удзельнікаў нарады на падрыхтоўку каня да вясны. Ах таго, як будзе падрыхтован конь — залежыць поспех сяўбы, поспех барацьбы за ўраджай.

Нарада выявіла многа недахопаў па конегадоўлі. Абавязак раённых арганізацый — дапамагчы калгасам карэнным чынам палепшыць справу развіцця конегадоўлі.

На Усебеларускай нарадзе конюхаў-брыгадзіраў. НА ЗДЫМКУ: старшы конюх калгаса «Кастрычнік», Прапойскага раёна, ордэнаносец Н. В. Батоўкін гутарыць з брыгадзірам, конегадоўчай брыгады калгаса «Новы будаўнік», Чырвонаслабодскага раёна, тав. А. І. Ганчарык.

Фото Лупейка. (ВСФ).

ВЫГАДУЮ ПЯЦЬДЗЕСЯТ ЖАРАБЯТ

У гутарцы з другімі конюхамі я даведаўся, што на многіх канюшнях дрэнна арганізавана работа. Няма, як кажуць, парадку. Абязлічка ў догляде, дрэнная чыстка коней, недахоп кармоў.

А чаму не хапае кармоў? Кармоў не хапае таму, што іх не па-гаспадарчаму расходуюць, не эканомяць.

Я рад падзяліць сваім вопытам работы. Яшчэ з восені ў нас складзен кармавы баланс і ўсе кармы атрыманы мною па акту. Ніхто імі не распараджаецца, апрача мяне. Таксама ўсе коні прымацаваны да конюхаў, няма абязлічкі. Догляд у нас правільны, кожны раз коркім у адзін час, таму і конь у нас у добрым целе, сыты.

У некаторых калгасах дрэнная збруя. Там, мабыць, не ніколі не рамантуюць. Гэта не па-гаспадарску. Я лічу так, што як сталяр без свайго гобліка не можа працаваць, так і конь без збруі. Першая задача конюха перагледзець збрую, пачысціць яе, змазаць. Мы падрыхтавалі збрую да кожнага каня. Калі выйдзем на поле, не будзе балець галава.

Конюхі ў нашым калгасе сталыя, падабраны з лепшых калгаснікаў. Калгаснікі самі цікавяцца нашай работай, выклікаюць нас на сход і пытаюць, як мы працуем. Гэта многа дапамагае ў рабоце.

Зараз на канюшні стаіць 167 коней, з іх 50 конематак. Усе конематкі жарэбныя. Я ўпэўнен, што будзе 50 маладых жарабят. Кабылы ўжо вызвалены ад цяжкіх работ, пастаўлены на адпачынак.

Усе коні падрыхтаваны да сяўбы. Для іх пакінулі лепшы корм. З добрым канём мы добра справімся ўгноіць і апрацаваць глебу. Сяўбу правядзем добраякасна.

БАТОЎКІН Н. Е.

Ордэнаносец — старшы конюх калгаса «Кастрычнік» Прапойскага раёна.

КОНІ ГАТОВЫ ДА ЛЮБОГА ПАХОДУ

Конюх вывеў на двор стройнага, прыгожага каня. Яго ледзь можна было ўтрымаць у руках. Ён падымаў высока ўгору сваю буйную галаву, прыгожа выгінаў мясістую шыю і біў аб зямлю капытамі.

— О, гэта конь! — захапляліся людзі, абкружыўшы яго з усіх бакоў.

— Лёўка дрэнных коней не гадуе, — моцна трымаючы абодвума рукамі за аброць, гаварыў конюх.—Вось паглядзіце ў канюшні на маю галоўлю.

У цёплай і прасторнай канюшні сталі жарэбныя конематкі, рабочыя коні, маладняк. Яны весела стрыглі вушамі, усе былі ў добрым целе.

— Гэта — нашы варашылаўцы, — паказваў Лёўка маладняк мінулага года.

У загарадзі гулялі добрыя рослыя жарабяты. Яны былі расстаўлены па групах згодна сваёй масці і пароды. Усё гэта зроблена конюхам, які любіць жарабят і гадуе іх клапатліва, аддана. Лёўка напамяць называе той дзень, калі нарадзілася кожнае жарабё.

Летась ажарабілася 15 конематак, якія далі 15 прыгожых пародзістых жарабят. Конюх Лёўка ўсіх іх выгадаваў, без адхнага адыходу. На гэты год злучана 17 кабыл, ад якіх будзе 17 жарабят.

Конюх паказвае жаробных конематак. Ён выводзіць з загарадкі маладую кабыліцу па клічцы «Красотка». Кабыліца ў вышэйсярэдняй упітанасці, чыстая і васёлая. Так выглядаюць усе конематкі. За імі наладжан асаблівы догляд.

Усе коні ў вышэйсярэдняй упітанасці. Няма ніводнага слабага або худога. Любы конь — ці ён рабочы, ці вызяны — кожны дзень вычышчаны, своечасова накормлены і напоены.

І калі Лёўка выводзіць коней на вадапой або прагулку, ён ледзь можа ўтрымаць іх у руках, яны не стаяць на месцы, рвуцца... Конюх радуецца гэтаму. Ён паказвае сваіх «арлоў» і пешыцца імі. А пешыцца ёсць чым, ёсць каго паказваць.

* * *

Яго сапраўднае прозвішча і імя — Жданко Лявон. А Лёўка — гэта больш пяшчотна, таму вось так і празвалі яго ў саўгасе. І малы, і стары называюць Лявона звычайна — Лёўка.

Жданко Лявон ужо шосты год працуе старшым конюхам у саўгасе «Рачкавічы», Чырвонаслабодскага раёна. За гэты час ён пастаўіў работу на канюшні сапраўды па-ўзорнаму. На канюшні ён праводзіць увесь свой дзень. Лявон вялікі любіцель коней. За імі ён даглядае, як сам за сабой.

Калі-б ні спаткаў, заўсёды бачыш яго добра апранутым у чыстае адзенне.

— Конюх павінен быць культурным чалавекам, — кажа ён, пакручваючы свае караткаватыя вусы.

Зараз старшы конюх Жданко Лявон заняты падрыхтоўкай каня да веснавой сяўбы. Ён пастаўіў мэтай, каб да вясны кожны конь быў у вышэйшай упітанасці. Гэтага ён ужо дабіўся. Для кожнага рабочага каня — добрая збруя. Конюхі рыхтуюць на час сяўбы новыя пастромкі, вобраці, лейцы.

На канюшні ўвесь час знаходзіцца старшы конюх, арганізоўвае правільнае кармленне, догляд, чыстку. Калі ён праходзіць ля станкоў, коні прасоўваюць галовы і лагодна ржуць насустрач свайму гаспадару.

* * *

Часта да Лёўкі прыходзіць моладзь і старыя рабочыя. Яны — варашылаўскія кавалерысты, а Лёўка і сам запісаўся ў гэты гурток. Прыходзяць на канюшню і просяць яго пазнаёміць з доглядам коней.

— У любую мінуту можна засядаць любога каня для нашай слаўнай Чырвонай Арміі. Калі толькі спатрэбіцца, мы на сваіх конях будзем секчы ворага па-варашылаўску, — кажа Лёўка.

Двое коней з канюшні саўгаса ў мінулым годзе ўжо былі ў паходзе кавалерыйскага эскадрона, які хадзіў у Менск на народнае свята 11 ліпеня. Усе коні гатовы да любога паходу.

А. ЛОСЬ.

САРВАЦЬ МАСКУ З ВОРАГАЎ НАРОДУ

Паважаны тав. рэдактар!

Я ўвесь час уважліва сачыў за ходам працэса контрэволюцыйнай трацкісцкай банды, які з усёй яркасцю паказаў, што ворагі партыі і народу ні на мінуту не складаюць сваёй зброі і імкнуцца пахарваць магутнасць першай у свеце пролетарскай дзяржавы.

Працэс нібы пражэктарам асвяціў усё акаляючае мяне.

Я лічу, што ў сувязі з працэсам на нас, калгаснікаў прымежных раёнаў Совецкай Беларусі, накладаецца асаблівая адказнасць. Мы павінны больш уважліва прыглядацца да людзей, якія працуюць радам з намі. Трэба навучыцца своечасова распазнаваць і выкрываць ворага на кожным участку соцыялістычнага будаўніцтва.

Як прыклад, возьмем наш калгас «Прагрэс», Пелякоўскага сельсавета, Уздзенскага раёна.

Карыстаючыся прытупленнем класавай пільнасці раённых работнікаў і адсутнасцю кантролю з боку калгаснікаў, тут на працягу раду гадоў беспакарана арудуюць яўныя ворагі совецкага народу, якія імкнуцца на кожным кроку нам нашкодзіць.

З першага-ж дня арганізацыі калгаса ў 1930 годзе ў праўленне пралез чужы і варожы совецкаму ладу чалавек—Паўла Шымановіч.

У часе вайны з белапалякамі Шымановіч дэзертыраваў з радоў Чырвонай Арміі і арганізаваў банду на тэрыторыі нашага раёна. Пры першым паяўленні чырвоных байцоў банда распалася і разбеглася хто куды. Шымановіч уцёк у Польшчу, дзе пражываюць яго сваякі. Праз кароткі час ён вярнуўся на совецкую тэрыторыю і заняўся кантрабандай.

У 1930 годзе Шымановіч уступае ў калгас, дзе працятвае сваю падрыўную работу. Тут ён сустракаецца са сваім прыхільнікам і адмудмцам—старшынёй калгаса Макарэвічам. Да рэволюцыі Макарэвіч спекуляваў жывёлай. Дзякуючы блізарукасці некаторых партыйных работнікаў Макарэвічу ўдалося пралезці ў партыю. Вось гэтыя два прыяцелі не мала папрацавалі над тым, каб разбурыць наш калгас. І трэба прызнацца, што не без поспеху.

Я не буду пералічваць усе іх злачынствы, спынюся на больш характэрных. Яшчэ ў 1930 г. па ініцыятыве Шымановіча ў калгасе было пасавана 1000 пудоў бульбы, за што ён быў тады прыгаворан уздзенскім нарсудом да прымусовых работ. У 1932 годзе пад уплывам агітацыі Шымановіча пачынаецца масавы выхад з калгаса. Сам Шымановіч, каб замаскаваць свой варожы твар астаецца ў калгасе. У 1933-34 гг. ён робіць растрату калгасных грошай і раскрадае насенную бульбу.

Нарэшце, факты 1936 года. Старшыня калгаса Макарэвіч за год растраціў 1200 руб. калгасных грошай. Каб утоіць растрату, Макарэвіч выпісвае фальшывыя расходныя ордэры і выдае касіру распіску.

Рахункавод калгаса выкрывае злачынныя махінацыі Макарэвіча і паведамляе аб гэтым загадчыку Уздзенскім аддзяленнем дзяржбанка Палоніну. Апошні пасылае свайго інструктара Салаўя для праверкі. Інструктар замазвае справу і дае магчымасць злодзею рабіць свае злачынствы.

У часе ўборкі Шымановіч і Макарэвіч наносяць адчувальны ўдар па гаспадарцы. На полі астаюцца наўбранымі 50 гектараў сенажаці, 12 гектараў вікі, лубін. Уборка зернавых культур праходзіць з вялікімі стратамі.

Большасць коней калгаса выведзены са строю, амаль усе конематкі абартавалі. Карова, якая пабіла раённы рэкорд па ўдою і вызначалася для пасылкі на Усесаюзную сельскагаспадарчую выстаўку, таксама абартавала. На свінаферме вялікі адыход маладняка. Колькі загінула парасят—няжка сказаць, бо ніякага падліку не вядзецца.

На працягу трох год у калгасе будуецца лазня і ветэрынарны пункт. Злачынцы свядома зацягваюць будоўлю—незакончаныя будынкі пачалі гніць. У 1936 годзе ў калгасе пачалі будаваць кароўнік, які зноў-такі пакінулі на зіму без страх.

Так з года ў год разбураецца калгасная гаспадарка і абясцэньваецца вартасць калгаснага прадпрыемства.

Трэба сказаць што злачынная дзейнасць гэтай зграі праходзіць не без падтрымкі з боку некаторых раённых і сельсоветскіх работнікаў.

Адзін з нашых селькораў даслаў пісьмо ў ЦК КП(б)Б, у якім сігналізаваў аб агідных справах у калгасе «Прагрэс». Пісьмо пераслалі для расследвання раённаму камітэту партыі, які даручыў гэта зрабіць інструктару Нікановічу. Апошні прыехаў у калгас, склікаў агульны сход калгаснікаў. Праверку-ж фактаў, аб якіх пісаў селькор, Нікановіч адцягнуў да 2 гадзін ночы, калі большасць калгаснікаў разышлася. Асталіся толькі прыхільнікі Шымановіча і Макарэвіча. Яны выпеслі рэзалюцыю аб тым, што «факты не пацвердзіліся». Палітычны сляпец Нікановіч з гэтым згадзіўся.

Нельга прайсці міма ролі старшыні Пелякоўскага сельсовета Пукача. Гэта заядлы зажымшчык самакрытыкі, які патурае злачынствам старшыні калгаса. Усе допісы селькораў, што прыбываюць для праверкі і рэагавання, Пукач кладзе пад сукно.

Калі хто-небудзь з калгаснікаў указвае на недахопы, Пукач выклікае яго да сябе ў габінет і пагражае адправіць туды, дзе жывуць белыя мядзведзі.

На гэтым я канчаю сваё пісьмо. Спадзяюся, што нарэшце будзе сарвана маска з ворагаў народу і яны атрымаюць па заслугах.

З тав. прыпітаннем М. СТРЫГЕЛЬСКІ.

УЗОРНА ЗАХАВАЦЬ ЭКСПАНАТЫ

Важнейшай задачай раённых выставачных камітэтаў, побач з адборам экспанатаў на Усесаюзную сельскагаспадарчую выстаўку 1937 года, з'яўляецца ўзорнае захаванне экспанатаў у калгасах і саўгасах.

Праведзеная праверка ў радзе калгасаў паказвае, што ёсць выпадкі неправільнага захавання экспанатаў. Так, у калгасе імя Сталіна, Менскага раёна, снопікі ўраджаю падвешаны ў хаце-лабараторыі, але не завернуты. У выніку выгляд экспанатаў не мае натуральнага колеру, яны пацямнелі.

У радзе калгасаў снопікі загарнулі паперай толькі ў верхняй частцы калосоў і таму пры захаванні ад змены тэмпературы і вільготнасці незагорнутая частка мае зусім іншы, цямнейшы колер. Тут не ўлічылі, што для таго, каб экспанат найлепш захаваў свой натуральны выгляд да выстаўкі, неабходна снопік збожжа, валакна і інш. поўнасцю загортаць у паперу, захоўваць акуратна.

У калгасе імя Шаранговіча, Менскага раёна, экспанаты захоўваюцца ў скрынках. Пры ўскрыцці гэтых скрынак выяўлена многа мышэй, якія маглі пашкодзіць экспанаты.

Гэтыя факты гавораць аб адсутнасці кантролю за захаваннем экспанатаў у калгасах і саўгасах з боку раённых выставачных камітэтаў. Кожны снопік, адабраны для выстаўкі, павінен быць цалкам загорнуты ў паперу, а насенне ўсыпана ў падвойныя палатняныя мяшочкі і асобна падвешаны на дроце да столі ў сухім неапальваючымся памяшканні.

Да кожнага экспаната неабходна прымацаваць этыкетку з указаннем на ёй: назвы культуры, гатунку, ураджайнасці ўчастка, з якога прадстаўляецца экспанат, дакладная назва экспанета (калгас, брыгада, звяно) і яго адрас.

В. ПЕЦЬКО,
агранам-інструктар выставачнага камітэта БССР.

П. БРОЎКА.

УЗБРОЕНАЕ СЛОВА ПАЭТА

Апошні зборнік Андрэя Александровіча «Узброеныя песні» падагульняе яго пятнаццацігадовы творчы паэтычны шлях. Паэтычнае майстэрства паэта, яго шырокі тэматычны размах выразна выказаны ў вершах і паэмах, сабраных у гэтым зборніку. Ён па праву названы паэтам «Узброеныя песні», бо вершы і песні, змешчаныя ў ім, клічуць да барацьбы, паказваюць наша поўнакроўнае, соцыялістычнае жыццё. Творы зборніка зразумелы масам і пасабляюць ім мастацкім словам у вялікай напружанай рабоце. Вельмі характэрна іх актуальнасць, хвалюючая злабадзённасць, строгасць пабудовы, песеннасць іх складу, часта пабудаваная на выкарыстанні фальклору, прастата мовы.

Як мы знаем, прастата і разам з тым глыбіня паказу — самае вялікае паэтычнае майстэрства. І Андрэй Александровіч, як відаць са зборніка, многа зрабіў у гэтым напрамку. Ягоныя песні простыя па пабудове, вельмі песенныя. Ягоныя песні адбіваюць мужныя дні жыцця і працы нашай радзімы.

Спынімся на двух вершаваных раздзелах гэтай кнігі «Мужнасць пераможцаў» і «Галодная раніца». Вершы, змешчаныя ў іх, з'яўляюцца канцэнтрацыяй перамог паэта.

Кніга выказвае штодзенныя думы народу. І так як народ першаю думаю зварочваецца заўсёды да вялікага правадыра народаў таварыша Сталіна, ён адкрывае паэт Андрэй Александровіч свой новы зборнік—вершамі: «Сустрэча з таварышам Сталіным»...

Сталіна я бачыў у глушы Палесся,
Сталіна ў сялянскай хаце спатыкаў,
Сталіна я слухаў у народных песнях,
Сталіна ў дарозе сэрцам адшукаў.
Слаўнае спатканне. А ніяк не знаю,
Як прынесці Сталіну ўсю любоў сваю.
. . . . . .
Я стаю на ўзгор'і. Песні я складаю.
Я пяю пра шчасце. Сталіна пяю.

Песеннасць складу, вялікая лірычная цеплыня гэтага верша, пераказ глыбокіх пачуццяў народу да вялікага Сталіна, выказаны простаю, зразумелаю моваю, робяць гэты верш творам дасканалага паэтычнага майстэрства.

Паэт Александровіч вядомы ўсяму Совецкаму Саюзу. Яго паэтычны голас, узгадаваны большэвіцкай партыяй, ведаюць шматлікія народы нашай радзімы. Сіла творчасці Александровіча ў тым, што яна ўся сваімі думкамі з народам, з ягоным жыццём, шчаспем і радасцю, з ягонымі перажываннямі. Адно перажыванне тэм паэта з пераканальнай яскравасцю даводзіць гэта: песня пра Сталіна, песня пра баявыя паходы Серго Орджанікідзе, песня пролетарскага яднання, марш пра паход пераможцаў, жалобныя словы аб народным горы — смерці дарагога Сергея Міронавіча Кірава, песні калгаснага будаўніцтва і многа іншых, выказаных з высокай паэтычнай культурай — ставяць Андрэя Александровіча на адно з перадавых месц паэзіі Совецкай Беларусі.

Валоданнем майстэрствам паказу, паслядоўнай апавядальнасцю, напоенай гераізмам баявога палкаводца Серго Орджанікідзе, гучаць словы верша «Ноч у разведцы»:

...Пад Барысавым палонным,
За Бярозаю рэкой
Войска арміі Чырвонай
Сабірала сілы ў бой.
— Ледзь над лесам сонца ўзыйдзе
Фронт прарваць, нанёсшы ўдар, —
Выратаў Орджанікідзе —
Палкаводзец-камісар.
Знаў Серго сакрэт недарам,
Полк байцоў адвёў тайком
І, прарваўшы фронт ударам,
Закідаў ліхім агнём.

І вось гэта баладная, пераканальная форма змяняецца жалобным маршам народнага гора ў вершы «Спяна бясстрашных».

...Ад края ў край, як гнеў, як рокат
пяруна,
Грыміць салют над свежаю магілай.
Нясуць Рэспублікі апошні караул...
Як вал, праз Ленінград, ад Менска
і Паміра —
Ідзе ў Маскву пястрымны, грозны гул:
— Будзь памяць вечная табе,
таварыш Кіраў!

Народнае гора паказана паэтам-большэвікам з вялікаю сілай. Паэтычныя якасці Александровіча раслі разам з яго работаю паэта-грамадзяніна. Корні ягонай паэзіі ідуць ад штодзеннай актыўнай работы сярод прапоўных мас. Усім вядома, што Андрэй Александровіч многа часу аддае грамадскай рабоце. Ён прымаў удзел у гістарычным пасяджэнні Рэдакцыйнай камісіі Надзвычайнага VIII З'езду Совецаў СССР пад старшынствам таварыша Сталіна. А. Александровіч актыўна працаваў па перакладу думак народу ў пісьме вялікаму Сталіну ад беларускага народу, у стварэнні «Дванаццаці песень аб Чырвонай Арміі», прысвечаных першаму маршалу Кліменту Ефрэмавічу Варашылаву. Александровіч, як верны сын народу, перажывае кожную падзею, хвалюючую яго, таму цёпла і праўдзіва гучаць словы ягонага верша «Песня большэвіка»:

...Ордэнаносная краіна
Мая дзівосная, з табой —
Удвух быць пільнымі павінны
І на зямлі, і над зямлёй.
І ў ясны дзень, і ў непагоду
Я твой пясняр і будаўнік —
І я шчаслівы, бо заўсёды
Шчаслівы той—хто большэвік!

Пяро паэта падымае рознастайныя тэмы: рост сталіцы, уручэнне актаў калгасам на вечнае карыстанне зямлёй, героіка грамадзянскай вайны, мужнасць Чапаева, эпапея чэлюскінцаў і многа іншых. Яны палаўзены праўдзіва і глыбока.

Верш паэта «Галодная раніца» скупымі, скульптурнымі вобразамі, у кароткім размеры паказвае прыгнечанае жыццё рабочага класа ў фашысцкай Германіі. Лаканічнасць вобразаў — дасягненне паэта:

І калі паэт, поўны жалю да пакутных і нянавісці да прыгнятальнікаў, гаворыць:

...Работніца-матка ўышла на гару,
Праклянцем яна сустракала зару:
Сын з голаду згінуў. Расстрэлены муж.
— Каму ўсходзіш, сонца? Скажы мне,
каму?..
Распластай лягла ёй на грудзі зямля,
Як помнік магільны — на дрэве пятля.

— уяўляш увесь гэты жудасны малюнак знішчэння людзей, усю безвыходнасць жыцця рабочага чалавека пад уладаю фашыстаў. Беражлівыя адносіны да слова, умелае выкарыстоўванне слоўнага і вобразнага матэрыялу тут відавочны. І шчыра хвалююць радкі паэта, якія гавораць пра шлях, па якім ідуць прыгнечаныя да свайго вызвалення:

...Галодная раніца. Хлопчык малы
Падпольны лісток прадае з-пад полы.
Пазнаў слова «Левін»—таемна пазнаў.
Па сценах таемна яго ён пісаў:
Яно-ж акрыляла, як новая рань,
Як здань комунізма, шчаслівая здань!..

Паэт Александровіч добра ўяўляе, што робіцца ў капіталістычным Захадзе. Ён чуе і гнеў сыноў беларускай зямлі супроць ганебных акупантаў-белапалякаў, ён адчувае як расце і загартоўваецца непераможная сіла соцыяльнага і нацыянальнага вызвалення.

У вершы «Рамане на конкурс» ён гаворыць:

...Варыкадамі сыны прыгонных працы
Большэвіцкае здточваюць лязо.
І хмелем роспачы, ад штурму
ўратаваца,
Папове ўславілі раз'юшаны тэрор!
Уалятай, фокстрот! Шугай мільёнам зор!
Прымусім кроў віном пераліваца!

Гэтым паэт адказвае азвярэлым прыгнятальнікам на іх ганебную выдумку, якія дзеля ачмуты беспрацоўнага насельніцтва — абвяцілі конкурс на рамане для выкінання ў рэстаранах, каб разжалабіць паноў для дапамогі беспрацоўным. Паэт мастацкім словам разбівае гэтую ачмуту і паказвае, што працоўны, прыгнечаны народ знойдзе сваё вызваленне толькі праз барыкады — грамадзянскую вайну.

«Узброеныя песні», апрача раздзелаў, складзеных з вершаў самага апошняга часу, як «Мужнасць пераможцаў», «Сонца і песня», «Галодная раніца», складаюцца яшчэ з паэм, напісаных паэтам за апошнія гады. Тут «Пагранічная вясна», «Векапомная восень», «Хлебная зіма», новыя раздзелы да паэмы «Цені на сонцы» і «Шчаслівая дарога».

Паэмы Александровіча вядомы нашаму чытачу і па заслугах адзнэны ім, пра іх пісала наша крытыка. Гэтыя паэмы пабудаваны з вялікай цяплынёй і паказваюць на шырокі кругагляд паэта. Якою сілаю, сапраўдным маршам гучаць словы паэта, звернутыя да працоўных Заходняй Беларусі ў яго паэме «Пагранічная вясна»:

...І чуе сэрца гул падземны
— Сей агонь!
Падымайся, пад'яремны,
— Сей агонь!
У дзілнах Віслы, Шары
— Сей агонь!
Край збярэ ўраджай пажараў,
— Сей агонь!
Больш агню — запалу болей.
— Сей агонь!
Воля родзіцца ў падполлі,
— Сей агонь!

Александровіч валодае сюжэтам, гэта мы бачым на шматлікіх ягоных творах, як «Шчаслівая дарога», «Цені на сонцы» і інш. Паэма «Пагранічная вясна» пабудавана па прынцыпу злучэння лірычных кавалкаў. Адзіны, паслядоўны сюжэт надаў-бы паэме яшчэ больш сілы.

Новыя раздзелы паэмы «Цені на сонцы», — «Прафесар і стэнаграфістка», «Блат» дапаўняюць ранейшыя раздзелы паэмы, яны выкрываюць усё нездаровае, наносное на маладым совецкім арганізме. З фармальнага боку яны паказваюць, што Александровіч умела ўладае формаю сатырыстычнай пабудовы верша.

Раздзел кнігі «Дружба» складаецца з перакладаў. Тут Дзем'ян Бедны, Нікалай Асеў, Паўло Тычына, Нікалай Тіханаў, Іло Мосашвілі, Ізі Харык. Дадатнае ў перакладах — захаванне Александровічам індывідуальных асаблівасцей перакладзеных паэтаў. Змяшчэнне гэтага раздзела ў кнізе характарызуе Александровіча як мастака-перакладчыка і гаворыць аб яго добрай сувязі з паэтамі брацкіх рэспублік.

Александровіч паэт родны народным масам, жыва ўзнімаючы хвалюючыя падзеі нашага часу—выпусціў добрую кніжку.

«Узброеныя песні» бясспрэчна дасягненне нашай усёй совецкай паэзіі. Гэтая кніжка даводзіць, што ў Александровіча найвялікшыя магчымасці пабудовы яшчэ больш мастацкіх палотнаў, паказваючых наша багатае, радаснае жыццё. Паэт добра авалодаў формай. Тэм у яго бязмежны запас.

Александровіча ў далейшым чакаюць яшчэ большыя творчыя поспехі.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

Да стагоддзя з дня смерці А. С. Пушкіна

УРАЧЫСТАЕ ПАСЯДЖЭННЕ АКАДЭМІІ НАВУК БССР

6 лютага Акадэмія навук БССР адзначала стагоддзе са дня смерці А. С. Пушкіна. У 12 гадзін дня вялікую залу мэнскага Дома партактыва запоўніла шматлюдная аудыторыя. Разам з акадэмікамі, прафесарамі і навуковымі работнікамі на ўрачыстае пасяджэнне прышлі запрошаныя стахановцы фабрык і заводаў, прадстаўнікі партыйных, совецкіх і грамадскіх арганізацый сталіцы БССР.

У глыбіні залі каля трыбуны сярод кветак—партрэт А. С. Пушкіна, чыю памяць з бязмернай любоўю ўшаноўвае разам з усімі брацкімі народамі Совецкага Саюза і беларускі народ.

Пра гэту любоў беларускага народу да вялікага рускага паэта гаварыў, адкрываючы пасяджэнне, прэзідэнт Акадэміі навук акадэмік І. З. Сурта. Шырокая падрыхтоўка да пушкінскіх дзён, разгорнутая ва ўсіх кутках Беларусі, з'яўляецца жывой ілюстрацыяй гэтай любві.

Акадэмік Сурта паведаміў, што з Вільнева (Швейцарыя) атрымана пісьмо ад Рамэн Ралана ў адказ на просьбу прэзідыума Акадэміі напісаць аб Пушкіне для Акадэміі навук БССР.

Цёплымі апладысментамі былі спатканы словы прывітання вялікага друга народаў СССР.

З выключнай увагай на ранішнім пасяджэнні былі выслуханы даклады акадэміка І. І. Замоціна «Жыццё і творчасць А. С. Пушкіна» і акадэміка С. Я. Вальфсона «Аб светапоглядзе Пушкіна».

Вячэрняе пасяджэнне было прысвечана дакладам прафесара Ламцёва «Пушкін—творэц рускай літаратурнай мовы» і праф. Браніштэйна «Пушкін і беларуская літаратура».

Народны паэт БССР акадэмік Якуб Колас прачытаў першую песню паэмы Пушкіна «Палтава», якая поўнасцю перакладзена ім на беларускую мову. Майстэрскі зроблены пераклад выклікаў шчырае захапленне прысутных.

Бурнай авацыяй зала спаткала прапанову пасласць прывітальную тэлеграму правадыру народаў вялікаму Сталіну.

Закрываючы пасяджэнне, тав. Сурта адзначыў выключную каштоўнасць прачытаных дакладаў і паведаміў, што Акадэмія навук выдае матэрыялы пасяджэння асобнай кнігай.

У заключэнне сіламі акцёраў 1-га Беларускага дзяржаўнага тэатра быў наладжан вялікі канцэрт, на якім былі выкананы рознастайныя нумары па тэматыцы твораў А. С. Пушкіна.

Аб светапоглядзе Пушкіна

Даклад акадэміка С. Я. ВАЛЬФСОНА

Пушкін не толькі геніяльны паэт, роданачальнік новай рускай літаратуры, творэц рускай літаратурнай мовы, але і мысліцель, чалавек філософскай мысьлі.

Чароўная прыгожасць пушкінскіх твораў злучаецца з глыбокім ідэйным зместам. Пушкінская творчасць насычана філософіяй. Ён кіраваўся да пытанняў сэнсу жыцця, яго мэт, прадназначэння чалавека, немінучасці смерці, аб лёсе, аб узаемадносінах асобы і калектыва, аб уладзе, аб сумленні, аб любві і т. д. Зразумела, што геніяльны паэт у выражэнні гэтых пытанняў не мог перашагнуць за межы эпохі, што адказы, якія ён даваў на іх, былі класава абмежаваны.

Пушкін — сын эпохі, напоўненай бурнымі палітычнымі падзеямі, меўшымі буйнейшае гістарычнае значэнне. Гэтыя падзеі пакідалі ў ім адпаведныя ідэалагічныя напластаванні. На светапогляд Пушкіна паклалі адбітак перадавыя прагрэсіўныя ідэі яго эпохі, на культурных вяршынях якой жыў паэт.

Пушкін да канца жыцця заставаўся прыхільнікам асветніцкай матэрыялістычнай філософіі французскай рэвалюцыйнай буржуазіі, аддаючы перавагу ёй перад ідэалістычнай і рэакцыйнай філософіяй эпохі рэстаўрацыі.

Пушкін увайшоў у жыццё поўным радасці, смяючыся, любячы жыццё, юнаком моцнага здароўя і тонкага розуму. Аднак, жыццё — складанае і суровае — адказала Пушкіну жорсткімі супярэчнасцямі яго лёсу. Незалежны, горды, самалюбны, ён быў вымушан знаходзіцца ў залежнасці ад розных нікчэмнасцей — ад жыраванага кота да захалускага цэнзара, — якія вяршылі яго лёсам, распараджаліся яго творчасцю. Пушкін літаральна задыхаўся ў акружаючай яго абстаноўцы рабаўладства і рабалепства, гнёту, ліслівасці і самавольства, у атмасферы царскага гвалту і деспатызма. Чалавэкалюбны, гуманны, ён бачыў вакол сябе прыніжэнне і падаўленне чалавечай асобы, адзекі над чалавекам, гібель чалавека. Гэтыя супярэчнасці робяцца адным з асноўных стрыжняў пушкінскай паэтычнай тэматыкі.

У сілу сваёй класавай належнасці і ўмоў эпохі ён не ведаў і не мог ведаць, дзе і як шукаць выхаду з усіх гэтых супярэчнасцей. Вось чаму часта бадзёры, прыродны, нутраны аптымізм уступаў месца бесперспектыўнасці і расчараванню. Паэт гатоў стаць прыхільнікам арганічна варожага яму песімістычнага светапогляду. На шчасце для паэта і на шчасце для нас Пушкін, наступаючы на горла сваёй бадзёрай, жыццерадаснай песні, не змог задушыць яе. Аптымізм перамог у Пушкіне песімізм, аптымізм, які караніцца ў бадзёрай і жыццерадаснай натуры паэта, у той-жа час прадуманы, адчуты, выпакутаваны, філософска асэнсоўны ў працэсе перамагання змрочных песімістычных настрояў, выказаны ў барацьбе з імі. Філософскі аптымізм Пушкіна непарыўна звязан з імкненнем ператварыць жыццё. Ён ведаў, што гэтую магчымасць трэба завяваць, што тысячы перашкод стаяць на яго шляху.

Светапогляд Пушкіна глыбока чалавечны. У паэце быў моцна развіт індывідуалізм, зброя, якою паэт змагаўся за сваю незалежную творчую асобу прыдворна-арыстакратычнай памеснічыцка-дваранскай чэрню, якая імкнулася падняволіць, або апляваць яго. Пушкін надзвычайна высока цаніў чалавека. Ён паўстаў супроць прыгнечання чалавека чалавекам, бо бачыў у гэтым парушэнне велізарнейшага прынцыпу самацэннасці і годнасці чалавечай асобы.

Пушкін моцна любіў жыццё. Ён быў страсным не толькі ў каханні, але і ў працы, але і ў мыслях.

Адным з важных бакоў светапогляду Пушкіна з'яўлялецца яго антырэлігійнасць, яго атэізм. Недарма 19 кастрычніка 1836 года ў пісьме да П. Я. Чаадаева Пушкін пісаў: «Рэлігія зусім чуждая нашым мыслям, нашым звычаям».

Атэізм Пушкіна, які носіць на сабе яркія сляды ўплыву французскіх матэрыялістаў XVIII стагоддзя, гэта, безумоўна, не наш атэізм, падпарадкаваны задачам класавай барацьбы пролетарыята і накіраваны на знішчэнне сацыяльных карэняў рэлігіі. Яго атэізм мае асветніцкі і абмежаваны характар. Ён, у асноўным, накіраван на выкрыццё царкоўнай хлусні, на выкрыццё рэлігійнага ханжаства.

Адным з кампанентаў пушкінскага светапогляду быў інтэрнацыяналізм. Паэт змог хораша з'яднаць рускі патрыятызм, сваю народнасць, сваю нацыянальную гордасць з інтэрнацыяналізмам, якім прасякнута яго творчасць, не ведаўшая нацыянальных граніц. Ён умеў расшыраць нацыянальны гарызонт, становячыся ў сваёй мастацкай творчасці грамадзянінам сусвету. Яшчэ больш ярка характарызуе інтэрнацыяналізм Пушкіна той факт, што Пушкіну «дорагі былі працоўныя ўсіх нацыянальнасцей, дорага была кожная мова, кожная культура» («Правда»). Ён падышоў да ўсіх гэтых народаў з інтарэсам, з вялікай чуласцю, са смагай пазнаць іх гісторыю, быт, норавы, культуру.

Інтарэс Пушкіна да «інародцаў» царскай Расіі не быў прадыктаваны бяздзейнай цікавасцю падарожніка. Не, Пушкін падышоў чула, любоўна, гуманна да народаў, якіх таптаў і расціскаў царскі бот.

Паэт, безумоўна, не ведаў і не прадбачыў, што наступіць час, калі Расійская імпэрыя, — царская катарга народаў — ператворыцца ў Саюз Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік, у вялікую шматнацыянальную дзяржаву сталінскай дружбы свабодных і роўнапраўных шчаслівых народаў. Але ён прадчуваў, што наступіць час, калі прыгнечаныя народы вырвуцца з царскіх цямніц. Ён быў упэўнен, што з любоўю і падзякай успомняць тады гэтыя народы аб адным з лепшых сыноў вялікага рускага народу, аб яго геніяльным паэце, які з'яднаў вялікае патрыятычнае пачуццё з адданасцю і дружбай у адносінах да шматлікіх нацыянальнасцей, прыціснутых царскім урадам.

Гэтая мара збылася.

Асобныя рысы светапогляду Пушкіна блізкі чалавеку сталінскай эпохі, і гэтай акалічнасцю тлумачыцца ўсенароднасць пушкінскіх свят у СССР. Пушкін — частка той агульначалавечай культуры, якую топча і знішчае фашызм, але якую выратоўвае з крывавых лап фашызма рабочы клас.

Жыццё і творчасць А. С. Пушкіна

Даклад акадэміка І. І. ЗАМОЦІНА

Пры ацэнцы пушкінскай спадчыны ў дні ўсенароднага ўшанавання яго памяці неабходна ва ўсёй глыбіні ўскрыць ідэйна-мастацкі змест яго непераўзыдных рэалістычных твораў, якія нам блізкі і зразумелы, і ад якіх да нашай сучаснасці працягваюцца звязваючыя ніці.

Пушкін жыў і тварыў у тую эпоху, якая ў свеце ленінскага вучэння паўстае перад намі, як пачатковы этап у развіцці рэвалюцыйнага руху, прадстаўленым у 20-х гадах XIX стагоддзя рухам дзекабрыстаў.

Асноўны літаратурны масіў 20-х—30-х гадоў — Пушкін, Гогаль, Грыбаедаў, Лермантаў, узятыя ў цэлым, накіроўвалі свае майстэрства на крытычны паказ самадзяржаўна-прыгонніцкага ладу жыцця, і ў гэтым заключаецца высокая каштоўнасць іх мастацкага рэалізма.

У гэтай асноўнай групе літаратуры 20-х—30-х гг. Пушкін займае цэнтральнае месца. Ён быў глыбока звязаны з прагрэсіўнымі плынямі эпохі і творча шырока ахопліваў яе найбольш вострыя задачы і запатрабаванні. А. С. Пушкін пачынае свой творчы шлях цягай да дзекабрыстаў — палкімі гімнамі свабодзе і вострымі сатырамі па адрасу царскай рэакцыі, звязанай асабліва з канцом царствавання Александра I і разгулам аракчэўшчыны. У другой палове 20-х гадоў, пасля разгрому дзекабрыстаў, у асобе якіх сайшла з гістарычнай сцэны асноўная палітычная сіла эпохі, паэт быў вымушан склаўшайся абстаноўкай адыйсці ад сваіх юнацкіх парываў да рэвалюцыйнай барацьбы і, застаючыся ідэйна верным справе палітычнай свабоды, заняць іншую пазіцыю ў адносінах да самадзяржаўя. Сэнс гэтай пазіцыі паэта зводзіўся да таго, што ён, лічачыся з адбыўшымся фактам разгрому дзекабрыстаў, вырашае, ва ўмовах самадзяржаўнага ладу, прапагандаваць ідэі гуманізма і асветы і ў такім плане рыхтуецца супрацоўнічаць з урадам Нікалая I (гэтым, уласна кажучы, і абмяжоўвалася гэтак званае «прымірэнне» Пушкіна з сучасным яму палітычным ладам). Але калі паэт не знайшоў ва ўрадзе Нікалая I водгуку на свае прагрэсіўныя імкненні і з узмацненнем урадавай рэакцыі ў 30-х гадах страціў усякую надзею на супрацоўніцтва з царызмам, ён зноў абвастрыў свае крытычныя адносіны да рэчаіснасці нікалаеўскай Расіі і, застаючыся ў асноўным па пазіцыях дзекабрыстаў, прапагваў барацьбу з самадзяржаўем і прыгонніцтвам. Ідэалагічны рост Пушкіна быў нечакана абарваны яго заўчаснай смерцю ад варожай кулі, накіраванай з сферы той чорнай рэакцыі, з якою ён вёў бязлітасную барацьбу на працягу ўсяго свайго нядоўгага жыцця.

Пераходзячы да вынікаў свайго аналізу, дакладчык устанаўлівае тыя асноўныя моманты літаратурнай спадчыны А. С. Пушкіна, дзякуючы якім А. С. Пушкін паўстае перад намі як вялікі мастак-рэаліст, які не толькі шырока адлюстроўваў сучасную яму эпоху, але і глыбока паспіграў будучы лёс сваёй краіны; паўстае, як палкі барацьбіт супроць царскага самаўладства і супроць спадчыны цёмнай старажытнасці; як вялікі гуманіст, які на аснове «бясконцай павагі да годнасці чалавека» (Белінскі) змагаўся супроць самадзяржаўна-прыгонніцкага прыгнёту і гвалту, як паэт-жыццялюб, як пясняр цвярозай крытычнай думкі, як вялікі майстар слова, які моцна звязаў сябе з народнай творчасцю, як творэц літаратурнай мовы і асноваположнік новай рускай літаратуры.

Пушкінскі юбілей з'яўляецца гістарычным святам совецкай культуры, і вялікі нацыянальны рускі паэт паўстае перад намі, як вялікі паэт народаў совецкай краіны і як паэт сусветнага значэння.

Пушкін і беларуская літаратура

Даклад прафесара Я. БРАНШТЭЙНА

У пачатку даклада, характарызуючы адносіны царскага ўрада да памяці вялікага паэта, т. Браніштэйн прыводзіць два цікавых дакументы: цыркуляр па Віленскай вучэбнай акрузе за 1899 год, па якому царскі ўрад «всемилостивейше» дазволіў «постановку портретов Пушкина в актовых залах» і справаздачу аб ушанаванні памяці Пушкіна ў гомельскай гімназіі 26 мая 1899 года. На паніхідзе ў гімназіі агалошана была вечная памяць гасударам-імператарам Александру I і Нікалаю I.

Так царскі ўрад пабіў рэкорд подласці і іезуіцтва, двойчы асквярнёўшы памяць вялікага паэта паніхідамі па Александру I, які саслаў паэта ў росквіце яго юнацкіх сіл, і Нікалаю I, арганізаваўшаму забойства паэта.

Але працоўныя Беларусі, лепшыя прадстаўнікі беларускага народу, па-свойму ўшаноўвалі памяць паэта — 100-годзе з дня яго нараджэння. У самых глухіх кутках Беларусі стыхійна арганізоўваліся чыткі вершаў Пушкіна. Чыталі да позняй ночы, і пасля чыткі сяляне доўга не разыходзіліся. З трыногай аб гэтым гаворыць цыркуляры царскіх прыслужнікаў таго часу.

У паліцэйскіх засценках «Северо-Западного края» беларускія працоўныя пелі «Узника» Пушкіна, бясхітрасна вар'іруючы спеў на свой лад.

Гісторыя беларускай народнай культуры і ў прыватнасці гісторыя беларускай мастацкай літаратуры ёсць гісторыя брацкага яднання беларускага і рускага народу. Адзін з старэйшых і каштоўнейшых помнікаў параўнальна маладой беларускай мастацкай літаратуры — анонімная парадыйна-сатырычная паэма «Тарас на Парнасе»—кідае яркае святло на непасрэдны ўплыў Пушкіна на фармаванне беларускай мастацкай літаратуры.

Паэма напісана ў год трагічнай гібелі Пушкіна і з'явілася своеасаблівым водгукам на гібель паэта. Аўтар паэмы, бясспрэчна, з'яўляўся гарачым паклоннікам Пушкіна. Вось як ён малюе Булгарына — ворага Пушкіна:

«Гляджу сабе — аж гэта сівы,
Кароткі, тоўсты, як кабан,
Пяногавы, дужа некрасівы,
Крычыць, як ашалелы пан»...

Стаўшы паэтычным увасабленнем нацыянальнай самасвядомасці рускага народу, Пушкін натуральна стаў сцягам лепшых прадстаўнікоў прыгнечаных народаў.

У гэтым прычына велізарнага ўплыву Пушкіна на зачынальнікаў сучаснай беларускай мастацкай літаратуры — на творчасць Янкі Купалы і Якуба Коласа. Геній Пушкіна стаяў перад поглядамі Янкі Купалы і Якуба Коласа, калі яны, палнятыя на грэбні рэвалюцыйнай хвалі 1905 года, сталі зачынальнікамі беларускай літаратуры, мастацкім увасабленнем юнацтва, прачынаючагася беларускага народу. Аб гэтым расказаў Колас у газеце «Известия» ў чуллівай заметцы аб тым, як ён хлапчуком-пастушком чытаў Пушкіна.

У Пушкіна Купала і Колас пераняли гіганцкі вопыт стварэння сапраўды народнай літаратуры і сапраўднай літаратурнай мовы. Паэма Коласа «Новая зямля» сваім размерам, кампазіцыяй, тыпам разгорнутых метафар, лірычнымі адступленнямі, пейзажам да таго нагадвае Пушкіна, што ўжо ў першыя гады з'яўлення гэтай паэмы ўплыў Пушкіна на Коласа адзначаўся крытыкай.

Для таго, каб мець уяўленне аб тым, як Колас вар'іруе пушкінскі матэрыял, узмацняючы, бясспрэчна, арганічны для Пушкіна некрасаўскі элемент, дастаткова прачытаць верш Коласа «Водгулле». Верш «Водгулле» пабудован па ўзору верша Пушкіна «Эхо» з вар'іраванай канцоўкай у народніцкім духу.

Уплыў Пушкіна на беларускую паэзію не абмяжоўваецца, зразумела, творчасцю Купалы і Коласа.

Уплыў Пушкіна лёгка заўважыць у радзе вершаў Багдановіча, у няскончанай паэме П. Труса — «Цыганка», у вершах Александровіча, Броўкі, Глебкі і т. д.

Гутарка ідзе не толькі аб тэкставай пераклічцы. Пушкін вучыць майстэрству. Пушкін вучыць народнасці ў лепшым сэнсе гэтага слова.

На заводзе імя Мяснікова арудуе класавы вораг

Менскі вагонарамонтны завод імя Мяснікова з месяца ў месяц не выконвае сваё вытворчае задание. План рамонту вагонаў у 1936 г. выкананы на 87,9 проц. У чацвертым квартале на заводзе адчувалася асаблівая ліхарадка. У кастрычніку план выкананы на 52 проц., у лістападзе — на 64,5 проц. і ў снежні—на 59,3 проц. Не палепшылася работа завода і ў гэтым годзе. Студзеньскі план рамонту вагонаў выкананы толькі на 62 проц.

У чым-жа справа? Чаму важнейшае прадпрыемства чыгуначнага транспарту не выконвае свайго прамога абавязку?

Начальнік завода тав. Дзічкоўскі і значная частка адміністрацыйна-тэхнічных работнікаў тлумачаць ганебнае адставанне надзвычайна проста. На-першае — дрэнная забеспячэнне завода матэрыяламі і запаснымі часткамі, па-другое—н

ЗАМЕЖНЫЯ ВОДГУКІ НА ПРЫГАВОР ВЯРХОЎНАГА СУДА

Трацкісты—правакатары вайны

Н'Ю-ІОРК (буйнейшы цэнтр ЗША), 6 лютага. (БЕЛТА). У адным з буйнейшых памяшканняў Н'ю-Іорка «Мэдысон сквер гардэн» адбыўся арганізаваны камуністычнай партыяй масавы мітынг, на якім прысутнічала 18 тыс. чалавек. Удзельнікі мітынга ганьбілі трацкізм і абавязаліся арабіць усё для выгнання трацкістаў з амерыканскага рабочага руху.

Мітынг прыняў рашэнне адправіць таварышу Сталіну прывітальную тэлеграму, ацэньваючы прыгавор Ваеннай калегіі Вярхоўнага суда СССР па справе антысавецкага трацкісцкага цэнтра і выказаць спачуванне афярам трацкісцкіх шкодніцкіх актаў. «Мы, — указваецца ў рэзалюцыі, — асуджаем здзеянні трацкістаў, якія ў якасці адкрытых агентаў Гітлера і Мусаліні прабуюць раскалоць народны фронт у Іспаніі. Мы заяўляем, што толькі шляхам выгнання трацкістаў з рабочага руху можна аб'яднаць народныя масы ў барацьбе супроць фашызма, за дэмакратыю і мір».

Генеральны сакратар ЦК камуністычнай партыі ЗША Браўдэр, які выступіў на мітынгу з дакладам, гаварыў аб гнуснай ролі трацкістаў у правакацыі вайны. — Трацкізм, — сказаў Браўдэр, — з'яўляецца агентам фашызма і імкнецца нанесці першы ўдар Совецкаму Саюзу, каб аслабіць увесь сусветны фронт барацьбы супроць вайны і фашызма і нанесці шкоду антываенным і антыфашысцкім сілам ў кожнай краіне, уключаючы Злучаныя Штаты.

Удзельнікі мітынга наладзілі доўгія авацыі пры кожным упамінанні імя таварыша Сталіна.

Агенты германскай контрразведкі

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 6 лютага. (БЕЛТА). Орган радыкал-сацыялістаў газета «Эвр» друкуе сёння спецыяльны артыкул, азаглаўлены «Інтрыгі гітлераўскай Германіі ў Совецкім Саюзе», на тэму аб шпіёнскай і шкодніцкай дзейнасці германскіх агентаў у Совецкім Саюзе.

Газета ўказвае, што германскія фашысты з'яўляюцца «інтэрвенцыяністамі найгоршага тыпу».

«Працэс трацкістаў у Маскве, — гаворыць далей газета, — паказаў гэта наглядна; і большасць падсудных зрабіла канцэпт гэтага сенсацыйныя выкрыцці.

У шматлікіх актах шкодніцтва і тэрору, зробленых на працягу апошніх год на совецкіх прадпрыемствах, якія працуюць на абарону, устаноўлена адкрытае супрацоўніцтва Гестапо і агентаў контрразведкі з трацкістамі. Артыкул адзначае і іншыя акты ўмяшання Германіі ў справы Совецкага Саюза, указваючы, у прыватнасці, на гутарку Радэка з германскім ваенным аташэ на адным з дыпламатычных прыёмаў у Маскве, як на прыклад такога ўмяшання.

Здрадніцкая работа іспанскіх трацкістаў

МАДРЫД, 6 лютага. (БЕЛТА). Здрадніцкая работа іспанскіх трацкістаў, якія аб'ядналіся пад шыльдай «ПОУМ», выклікае з кожным днём усё большае абурэнне ўсіх шчырых антыфашыстаў незалежна ад іх партыйнай прыналежнасці. Арганізацыі народнага фронта мадрыдскага рабочага раёна Чамартынкэла Роса звярнуліся да ўрада з патрабаваннем пакласці рашучы канец здрадніцкім дзеянням «ПОУМ», аб'явіць гэту «партыю» па-за законам, спыніць выхад яе друку, канфіскаваць яе радыёстанцыі і, нарэшце, аддаць пад суд народнага трыбунала яе кіраўнікоў.

Дакумент гэты падпісан наступнымі арганізацыямі: партыяй «рэспубліканскай левай» і юнацкай арганізацыяй гэтай партыі, партыяй левых радыкал-сацыялістаў, партыяй «рэспубліканскі саюз», сацыялістычнай партыяй, комуністычнай партыяй, федэрацыяй аб'яднанай сацыялістычнай моладзі, усеагульным рабочым саюзам і анарха-сіндыкалісцкай «нацыянальнай канфедэрацыяй працы».

Каментуючы гэтыя выступленні, орган компартыі «Мундо обрэро» падкрэслівае, што выкараненне трацкісцкай здрады не ёсць справа якіх-небудзь пэўных арганізацый, але «ўсіх антыфашыстаў, якія праліваюць сваю кроў для перамогі і пічасця народу».

ІНТРЫГІ РЫБЕНТРОПА Ў АНГЛІІ

РЫМ (сталіца Італіі), 6 лютага. (БЕЛТА). Лонданскі карэспандэнт газеты «Джорнале д'Італія» адзначае глыбокае раздражанне англійскай грамадскасці інтрыгамі германскага пасла ў Лондане Рыбентропа. Рыбентропа абвінавачваюць у тым, што ён, заводзячы сувязі ў некаторых кансерватыўных колах, пляце інтрыгі супроць палітыкі англійскага ўрада і супроць Ідэна, міністра замежных спраў, даходзячы ў сваёй нагласці да спробы навязаць англійскаму ўраду кандыдатуру на пост англійскага пасла ў Берліне.

Газета ўказвае далей, што сярод іншых абвінавачанняў, прад'яўленых англічанамі Рыбентропу, трэба адзначыць і яго выступленне з нападкамі на Совецкі Саюз, з якім Англія падтрымлівае прыязныя адносіны.

У заключэнне «Джорнале д'Італія» перадае англійскае паведамленне, у якім указваецца, што Рыбентропу прыдзецца, мабыць, у хуткім часе пакінуць свой пост у Лондане.

У НАРКАМАЦЕ ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ

6 лютага пасланнік Фінляндыі п. Ір'е-Коскінен уручыў загадчыку 1-га заходняга аддзела НКЗС т. Карскаму каштоўныя падарункі з просьбай перадаць іх ад імя фінляндскага ўрада капітану парахода «Менжинский» Д. Ю. Сліпко і яго памочніку Н. В. Анчуціну ў знак падзякі за выратаванне параходам «Менжинский» 16 чалавек экіпажа і каманды фінскага парахода «Наппа», які затануў 25 кастрычніка 1936 года каля берагоў Эстоніі.

Ваенна-фашысцкі мяцеж у Іспаніі

НЯЎДАЧА МЯЦЕЖНІКАЎ НА ПАЎДНЁВЫМ ФРОНЦЕ

АГЛЯД ВАЕННЫХ АПЕРАЦЫЙ У ІСПАНІІ

Толькі гэтымі днямі камандуючы мяцежнымі войскамі на паўднёвым фронце, балбатун-генерал Кейпо дэ Льяно заявіў па радыё, што «Малага не з'яўляецца ў сучасны момант першачарговым аб'ектам для напыянальнай арміі». Заява гэта была зроблена пасля таго, як урадавыя войскі адбілі атаку мяцежнікаў на Фуэнхірола, прыморскі гарадок на шляху з Гібралтара ў Малагу.

Але ні то сам генерал, ні то яго германскія і італьянскія гаспадары змянілі сваё першапачатковае рашэнне. Яны не захацелі адмовіцца ад захопу такога ласавага аб'екта, якім з'яўляецца Малага. Акупацыя гэтага горада дала-б мяцежнікам апорную базу на Міжземным моры, у той час як пяпер ім прыходзіцца базаваць на дрэнна абсталяваны порт Алхесірас або на аддалены Кадыкс. Наступленне па Малагу было адноўлена, як толькі для гэтага былі сабраны дастатковыя сілы.

У паход адправіліся не толькі сухапутныя часці, у тым ліку і мараканцы, якімі мяцежнікі звычайна карыстаюцца як пушачным мясам скрозь, дзе ёсць небяспека вялікіх страт, але і ўсе морскія сілы генерала Франко. Генерал Кейпо дэ Льяно, асабіста прыняўшы ўдзел у паходзе, змясціў свой штаб на германскім лінкоры «Адмірал граф Шпее». Гэты лінкор і германскі крэйсер «Кельн» канвіравалі іспанскую мяцежную эскадру па дарозе ў Малагу.

Наступленне мяцежнікаў на Малагу ў раёне Марбелья — Фуэнхірола скончылася для іх плачэўна. Ім прышлося адступіць пад напорам урадавых войск на некалькі кілометраў. Атака з мора таксама аказалася няўдалай. Урадавая авіяцыя засыпала бомбамі мяцежныя крэйсеры і прымусіла іх уцякаць. Карэспандэнт англійскай газеты «Дэйлі геральд» паведамляе цікавы факт, што раней усіх пачалі ўцякаць германскія ваенныя караблі, відавочна, успомніўшыя, пры відзе ўрадавых бамбардыроўшчыкаў, аб «нейтралітэце Германіі.

Урадавая авіяцыя адыграла буйную ролю ў адбіцці сухапутных атак і асабліва ў баях з авіяцыяй мяцежнікаў. Па паведамленню англійскай кансерватыўнай газеты «Таймс», збіты тры фашысцкія самалёты. («К.П.»).

СТАНОВІШЧА НА ФРАНТАХ

ПАЎНОЧНЫ ФРОНТ

БІЛЬБАО (сталіца Баскскай аўтаномнай вобласці), 5 лютага. (БЕЛТА). На астурыйскім участку паўночнага фронта на працягу ўсяго ўчарашняга дня адбывалася жорсткая артылерыйская перастрэлка ў раёне Овіедо (галоўны горад Астурыі). У самым горадзе агнём рэспубліканскай артылерыі разбуран уншчэнт дом астурыйскага банка, які мяцежнікі ператварылі ў значна ўмацаваны пункт. Прадаўжаецца масавае ўцяканне грамадзянскага насельніцтва з Овіедо. Ноччу на бок рэспубліканцаў перабягаюць цэлыя сем'і.

На біскайскім участку фронта ў раёне Маркіна атрад рэспубліканцаў атакаваў канвой мяцежнікаў, які суправаджаў абоз. У разультаце бою мяцежнікі былі прымушаны ўцякаць і пакінулі на полі бою шмат прыпасаў.

***

БІЛЬБАО (сталіца Баскскай аўтаномнай вобласці—Іспанія), 6 лютага. (БЕЛТА). 5 лютага ў Більбао быў прыведзен у выкананне смяротны прыгавор над германскім фашыстам-шпіёнам Эйнхатэнам, пляменнікам германскага пасла ў Аўстрыі Папена. Эйнхатэн быў узят у палон рэспубліканцамі на біскайскім (паўночным) фронце.

ПАЎДНЁВЫ ФРОНТ

ВАЛЕНСІЯ (горад на ўсходнім узбярэжжы Іспаніі, часовая рэзідэнцыя ўрада), 6 лютага. (БЕЛТА). Мяцежнікі сканцэнтроўваюць буйныя сілы ў раёнах Марбелья, Бурго, Антэкера, Алама дэ Грэнада (на франтах Малагі). У складзе гэтых войск ёсць значныя італьянскія і германскія сілы. Не гледзячы на жорсткія баі ў гэтых раёнах, рэспубліканскія часці аказваюць гераічнае супраціўленне і нярэдка пераходзяць да частковых контратак. Ля Бурго рэспубліканскімі часцямі захвачаны 4 станкавыя кулямёты, 200 вінтовак і адзін танк. Рэспубліканская авіяцыя, не гледзячы на сваю малакольканасць ва ўказаным раёне, дзейнічае паспяхова.

Учора на світанні караблі мяцежнікаў «Альміранто Сэрвера», «Канарыас» і «Балеарас» адкрылі артылерыйскі агонь па прыбярэжнаму шасе паміж Мотрыль і Малагай. Парушаная часова тэлеграфная і тэлефонная сувязь з Малагай была позна ноччу адноўлена.

Германскія і італьянскія ваенныя караблі актыўна дапамагаюць мяцежнікам, блакіруючы морскую базу рэспубліканскага флота — Картахену.

***

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 6 лютага. (БЕЛТА). Мадрыдскі карэспандэнт кансерватыўнай газеты «Таймс» паведамляе, што ў раёне Кардовы (на поўдні Іспаніі) адзначаецца значнае наступленне ўрадавых войск. Урадавыя войскі расшырылі свае аперацыі ў раёне Посабланка і ўступілі ў сучасны момант на тэрыторыю, якая знаходзілася з пачатку грамадзянскай вайны ў руках мяцежнікаў. Карэспандэнт пацвярджае, што ўрадавыя войскі занялі Вільяфранку (на паўночны ўсход ад Кардовы).

МІТЫНГ У МАДРЫДЗЕ

МАДРЫД (сталіца Іспаніі), 6 лютага. (БЕЛТА). У сувязі з прыбыццём у Мадрыд генеральнага сакратара французкай компартыі Марыса Торэза, мадрыдскі абласны камітэт іспанскай компартыі арганізаваў вялікі мітынг у кіно «Саламанка». Мітынг адкрыў сакратар мадрыдскага абласнога камітэта компартыі Франсіско Антоніо. Прысутныя на мітынгу стоячы віталі Торэза воклічамі: «Няхай жыве народны фронт і дэмакратычная Францыя!» і спевам «Марсельезы» і «Інтэрнацыянала».

„ВАЙНА—ВАЙНЕ"

Фінальная сцэна з 4 акта п'есы Якуба Коласа «Вайна—вайне». Фото Галашова.

Ужо прайшло рад спектакляў п'есы народнага паэта рэспублікі Якуба Коласа «Вайна вайне» і пяпер можна зусім аб'ектыўна гаварыць аб гераічным прыёме п'есы совецкім глядачом, аб бурным акцэнце глядзельнай залы на працягу ўсіх спектакляў у БДТ-2.

Якуб Колас гады чатыры таму назад запісаў рад значных і насычаных сцэн, аб'ёмам на цэлую п'есу. Але ні ён, ні нашы тэатры не браліся за рэалізацыю гэтага твору на сцэне.

Якуб Колас па сваёй скромнасці вялікага даравання сапраўднага мастака не пранітурхоўваў сам свайго твору на сцэну, а кіраўнікі нашых тэатраў чамусьці не запікавіліся ў гэтых першапачатковых спробах зерням здаровага рэалістычнага вялікага твору, якія аўтарам маглі быць завостраны сцэнічна і ўкамплектаваны ў дзейсную п'есу.

Мы рады, што БДТ-2 удалося творча і дружна папрацаваць з Якубам Коласам, і гэта дружба ўвянчалася поспехам. Народны паэт Якуб Колас, які ўпершыню выступіў як драматург, адразу ярка і пераканаўча загаварыў са сваім чытачом-глядачом са сцэны.

Мы рады выключнаму поспеху спектакля і развітальным словам Якуба Коласа, якія стымулююць нас на далейшыя дасягненні: «Я рад, што наша сумесная работа не агінула марна. Я ніколі не адчуваў такога творчага ўзлёту, перачытваючы свае творы, як пяпер, калі адзін з іх я ўпершыню пачуў і ўбачыў са сцэны. Буду прапаваць іля сцэны і далей».

Толькі ў песным кантэксце ўсіх кампанентаў спектакля і ў першую чаргу драматурга і рэжысера з'явяцца п'есы, вартыя 20-ай гадавіны Вялікага Кастрычніка.

Мастацкі кіраўнік БДТ-2
рэжысер В. ДАРВІШАЎ.

ПУШКІНСКІЯ ДНІ У ШКОЛАХ БССР

Нарком асветы БССР тав. Дзякаў даў пісьмовае ўказанне ўсім акруговым, гарадскім і раённым аддзелам народнай асветы аб парадку правядзення ўшанавання памяці А. С. Пушкіна ў школах рэспублікі.

Паводле гэтага ўказання, пушкінскія дні ў школах праводзяцца з 10 па 20 лютага.

10 лютага пасля першых трох урокаў у пачатковых школах і ў першых чатырох класах няпоўных сярэдніх і сярэдніх школ настаўнікі праводзяць гутаркі аб жыцці і творчасці А. С. Пушкіна. Пасля гутаркі — паказ вучнёўскай мастацкай самадзейнасці.

У няпоўных сярэдніх і сярэдніх школах праводзяцца агульныя ўрачыстыя сходы вучняў і настаўнікаў (асобна V—VII і VIII—X клясаў) з дакладам аб жыцці і дзейнасці А. С. Пушкіна, пасля якога наладжваецца паказ вучнёўскай мастацкай самадзейнасці.

Указаннямі Наркомасветы таксама прадугледжваецца правядзенне школьных літаратурна-музычных вечароў памяці А. С. Пушкіна і сумесныя ўрачыстыя сходы вучняў VII—X класаў школ гарадскіх і раённых цэнтраў.

Вывучэнне твораў паэта ў парадку выкладання ў школах праводзіцца па ўстаноўленай Наркомасветы праграме.

НАПЯРЭДАДНІ ДНЯ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

Слаўную гадавіну—Дзень Чырвонай Арміі—коннікі кавалерыйскай дывізіі адзначаць палкавымі спаборніцтвамі лепшых падразаяленняў. У эскадронах ідзе дзейная падрыхтоўка да гэтых спаборніцтваў. Адзяленні, узводы, эскадроны спаборнічаюць паміж сабой, нарастваюць поспехі баявой і палітычнай вучобы.

Праграма спаборніцтваў уключае ў сябе і лыжныя прабегі, і спаборніцтвы ў рубцы, джыгітоўцы, перамаганні складанейшых перашкод і стральбу. Эскадрон, дзе палітруком т. Мейеровіч, трымае пярэшынства ў палку. У эскадроне няма ні аднаго байца, ні аднаго камандзіра, якія-б не спаборнічалі паміж сабой. П. ВАЛЬД.

Ад Жлобінскага РК КП(б)Б

Згубленую кандыдацкую картку № 0549068 узору 1936 года, выданую Жлобінскім РК КП(б)Б на імя Гарэліка Нісана Залманава, лічыць несапраўднай.

Сакратар Жлобінскага РК КП(б)Б
ЛЕХЕРЗАК.

ДЗЕННІК

Семінар прапагандыстаў Сталінскага раёна адбудзецца 9 лютага ў 9 гадзін раніцы ў Доме партактыва (пакой № 22).

Адказны рэдактар Д. В. ЮРКОЎ.

ЭЛЕКТРАСТАНЦЫЯ
ДАВОДЗІЦЬ ДА ВЕДАМА ГРАМАДЗЯН г. МЕНСКА, ШТО З 1 ЛЮТАГА г. г. АРГАНІЗАВАНА
БЮРО АБСЛУГОЎВАННЯ СПАЖЫЎЦОЎ ЭЛЕТРАЭНЕРГІІ „БАС"
БЮРО ВЫКОНВАЕ
1. ВЫПРАЎЛЕННЕ ЎНУТРАНЫХ І ЗНАДВОРНЫХ ПАШКОДЖАННЯЎ ЭЛЕКТРАПРАВОДАК.
2. УСТАНОЎКА І ЗНЯЦЦЕ ШЧОТЧЫКАЎ.
НАСТУПНЫЯ РАБОТЫ:
3. УСТАНОЎКА КАНТРОЛЬНЫХ ШЧОТЧЫКАЎ.
4. СКЛАДАННЕ КАШТАРЫСАЎ НА ЎВОДЫ, ЎНУТРАНЫЯ ПРАВОДКІ І ВЫКАНАННЕ ГЭТЫХ РАБОТ.
5. РАМОНТ ЗНАДВОРНЫХ УВОДАЎ І ЎНУТРАНЫХ ПРАВОДАК (ЗАМЕНА ПРАВАДОЎ і т. д.).
ЗАЯЎКІ прымаюцца штодзенна, уключаючы і выходныя дні, з 8 гадзін раніцы да 12 гадзін ночы асабіста і па тэлефонах №№ 20-691 і 20-765.
АДМІНІСТРАЦЫЯ.

Пельмені
Магазін № 1 ГАЛОЎМЯСА
(Совецкая, 36)
Штодзенна ЕСЦЬ у ПРОДАЖЫ
свежыя ПЕЛЬМЕНІ
ПІРАЖКІ з МЯСАМ
САСІСКІ
САРДЭЛЬКІ
Вялікі выбар розных каўбасных вырабаў
Штодзенна паступае
СВЕЖАЕ МЯСА
ўсіх відаў упітанасці і гатункаў
У МАГАЗІНЕ ЕСЦЬ У ПРОДАЖЫ
МЯСНЫ БУЛЬЕН У КУБІКАХ
І МЯСНЫ ЭКСТРАКТ
Магазін адкрыт з 8 г. раніцы да 11½г. веч.

ДА ЎВАГІ ПАКУПНІКОЎ!
Рознічны Магазін Белшвэйснабзбыта
(Совецкая, 97/Г.)
Тэлефон № 22-[illegible]
МАЕ штодзенна ў продажы
МУЖЧЫНСКІЯ ПАЛІТО ЗІМОВЫЯ, КАСЦЮМЫ ВЫСОКАЯКАСНЫЯ І ЗВЫЧАЙНЫЯ, ПІДЖАКІ І БРУКІ АСОБНА, БЯЛІЗНА РОЗНАЯ І ГАЛАЎНЫЯ ЎБОРЫ.
ЖАНОЧЫЯ ДЭМІ-ПАЛІТО, КАСЦЮМЫ, ШАЎКОВЫЯ І ШАРСЦЯНЫЯ ПЛАЦІЦІ, БЛЮЗКІ ШАЎКОВЫЯ І СПАДНІЦЫ ШАРСЦЯНЫЯ. БЯЛІЗНА ЖАНОЧАЯ І ПАСЦЕЛЬНЫЯ ПРЫНАЛЕЖНАСЦІ ДЛЯ ДЯЦЕЙ ШКОЛЬНАГА І ДАШКОЛЬНАГА ЎЗРОСТУ І СУКОННЫЯ КАСЦЮМЧЫКІ.
ДЫРЭКЦЫЯ.

ГАТУНКОВАЕ НАСЕННЕ
ТРАЎ КАНЮШЫНЫ, КОРАНЬПЛОДАЎ, ГАРОДНЫХ КУЛЬТУР І КВЕТАК
ПРАДАЕЦЦА З ЛАРКОЎ, СКЛАДАЎ І БАЗ
ДЗЯРЖСОРТФОНДА
У МЕНСКУ (НА РЫНКАХ — КРЫТЫМ, ЧЭРВЕНЬСКІМ І ПЛЯЦЫ 25 КАСТРЫЧНІКА). У ТАЛАЧЫНЕ, ОРШЫ, ПОЛАЦКУ, НЕГАРЭЛЫМ, РУДЗЕНСКУ, ПУХАВІЧАХ, БАБРУЙСКУ, СЛУЦКУ, КОПЫЛІ, РАГАЧОВЕ, МАГІЛЕВЕ, БЯЛЫНІЧАХ, ГОМЕЛІ, ВЕТКІ, ПЕРАХОЎЦЫ, ВІЦЕБСКУ І КАЛІНКАВІЧАХ.
ПРОДАЖ НАСЕННЯ ПРАВОДЗІЦЦА ЎСІМ ПА ДЗЯРЖАЎНЫХ ЦЭНАХ.
ЦЭНЫ НА НАСЕННЕ ПАВЕДАМЛЯЮЦЦА БЯСПЛАТНА ПА ПЕРШАМУ ПАТРАБАВАННЮ
па адрасу: г. Менск, рог Энгельса і Комуністычная, 18/11, Белканторы Дзяржсортфонда (тэл. 22-681, 22-564)
БЕЛКАНТОРА ДЗЯРЖСОРТФОНДА.

СЕННЯ Ў ТЭАТРАХ І КІНО
БЕЛАРУСКІ ПЕРШЫ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР (БДТ-1)
8 лютага Абан. № 38.
ВАЎКІ І АВЕЧКІ
ДЗЯРЖ. ЯЎРЭЙСКІ ТЭАТР БССР
8 лютага Абан. № 66.
БОРАГ
Гукавы кінатэатр «Чырвоная зорка»
ДУБРОЎСКІ
Гукавы кінатэатр «Інтэрнацыянал»
ВЫПАДКОВАЯ СУСТРЭЧА
Дзіцячы гукавы кінатэатр
ФЕДЗЬКА
Гукавы кінатэатр «Пролетарый»
ФЕДЗЬКА
Гукавы кінатэатр «Спартак»
ДА ПАДЗЕЙ У ІСПАНІІ
з 1 па 12 выпуск — 12 выпускаў у адзін сеанс.

ЗГУБЛЕН бумажнік з дакументамі на імя Л. А. ВАСЮКЕВІЧА. Знайшоўшага прашу звярнуць за ўзнагароду ў аддзел аб'яў выдавецтва «Звязды».

Мясцком і калектыў работнікаў рэдакцыі і выдавецтва газеты «Звязда», выказваюць сваё спачуванне работніку выдавецтва «Звязда» тав. Спеляну з прычыны смерці
ЯГО МАЦІ.

НКМП БССР
Белметаласнабзбыт
МАГАЗІН „СТАНКАІНСТРУМЕНТ"
Пляц Волі, 25/1, тэл. 22-304
ДА ЎВАГІ ПАКУПНІКОЎ!
МАГАЗІН «СТАНКАІНСТРУМЕНТ»
МАЕ ў ПРОДАЖЫ:
НАСОСЫ «Верцінгтона» 2—1 3-дзюймовыя.
ВЕНТЫЛЯТАРЫ «Сірока» № 4.
КОНТРПРЫВОДЫ.
НАЖДАЧНЫЯ КАМНІ розных размераў.
ВАГІ соценныя «Фалько», стаповыя 5 і 20 кілограмавыя, ручныя бязмены 10-кілограмавыя.
ВАТЭРПАСЫ двух гатункаў.
ПАТРОНЫ для свідравальных варштатаў розных размераў.
КЛУПЫ газавыя і механічныя — розных размераў.
ТРУБАРЭЗЫ.
ТРАШЧОТКІ.
КЛЮЧЫ гаечныя.
ФАНТАНЧЫКІ — піццёвыя капонкі (для піцця без кубкаў).
КАНДЗІСЦЫЙНЫЯ ГАРШКІ № 1 і № 2.
МАГАЗІН АДКРЫТ З 10 ГАДЗІН РАНІЦЫ ДА 5 ГАДЗ. ВЕЧАРА.
ДЫРЭКЦЫЯ.

Пры менсавузе АДКРЫВАЮЦЦА ТРОХМЕСЯЧНЫЯ КУРСЫ ДАШКОЛЬНЫХ РАБОТНІКАЎ.
На курсы прымаюцца асобы з адукацыяй не ніжэй 7 класаў. Курсанты забяспечваюцца стыпендыяй.
Заявы прымаюцца да 10 лютага з 9 да 12 гадзін штодзенна.
АДРАС: горсовет, 2-гі паверх, пакой 24.
ГАРАНА.

БЕЛДЗЯРЖКІНО
ПРАВОДЗІЦЬ
ПАДРЫХТОЎКУ КАДРАЎ
ДЛЯ КІНОСТУДЫІ,
якая будуецца ў Менску, па наступных спецыяльнасцях:
1. РЭЖЫСЁРАЎ І ІХ АСІСТЭНТАЎ;
2. АПЕРАТАРАЎ І ІХ АСІСТЭНТАЎ;
3. СЦЭНАРЫСТАЎ І КАНСУЛЬТАНТАЎ;
4. ДЫРЭКТАРОЎ БРЫГАД І ІХ НАМЕСНІКАЎ;
5. КІНО-АКТОРАЎ;
6. СПЕЦЫЯЛІСТАЎ ПА АПРАЦОЎЦЫ ПЛЁНКІ (з ліку інжынераў-хімікаў);
7. МАСТАКОЎ, ШУМАВІКОЎ, ГРЫМЁРАЎ І БУТАФОРАЎ.
АСАБІСТЫ ПРЫЁМ: Белдзяржкіно, г. Менск, Совецкая, 90, 2-гі паверх, пак. № 13, днём з 11 да 2 г. і ўвечары з 6 да 8 гадзін.
ПІСЬМОВА — па вышэйпаказанаму адрасу.

У аддзел аб'яў званіце па тэл. 21-845

Уп. Галоўлітбела № К—560. Друкарня газеты «Звязда» Менск, Совецкая 63. К. Б. О.